Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 226 (5059)
КАСТРЫЧНІКА
9
АЎТОРАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

## ЦВК БССР МАЛДАЎСКАЙ АЎТАНОМНАЙ ССР

ЦВК БССР шле гарачае брацкае прывітанне рабочым, калгаснікам і ўсім працоўным Совецкай Малдавіі ў сувязі з дзесяцігоддзем арганізацыі Малдаўскай аўтаномнай ССР.

Правільна вырашаючы ленінскую нацыянальную палітыку пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б), Совецкая Малдавія, разам з усім Совецкім Саюзам, у барацьбе супроць шавіністаў усіх мастей, паспяхова будуе соцыялізм.

Няхай жыве Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!
Няхай жыве ленінскі ЦК ВКП(б) і яго правадыр тав. Сталін!
Няхай жыве Совецкая Аўтаномная Малдавія!

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар ЦВК БССР М. ЛЯЎКОЎ.

## ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ ПА ЎЗДЫМУ ЗЯБЛІВА

З года ў год па меры росту зазяблених плошчаў павышаецца ўраджайнасць калгасных палёў БССР. Аб тым, што гэта не выпадковасць гаворыць вопыт многіх гэтэнь калгасаў, якія за вопыт своечасовага ўздыму зяблівы паднялі ўраджай на 10-20 проц. Пярвейшае агратэхнічнае правіла барацьбы за ўраджай — зяблевае ворыва ўкаранілася ў практыку вытворчасці значнай часткі калгасаў БССР.

Іменна гэтым тлумачыцца той факт, што калгасы Аршанскага, Бярэзінскага, Магілеўскага і раду іншых раёнаў на месяц-два раней мінулага года своечасова выканалі план зяблівы.

Аднак, нямала ёсць яшчэ ў нас кіраўнікоў калгасаў, ды і не толькі калгасаў, але і раённых арганізацый, якія апартуністычна недаацениваюць зяблівы. Разважаючы гэтых людзей зводзіцца да даўно ведомай не раз асуджанай партыяй тэорыі чартовасці.

— Раней справімся з ураджаем гэтага года, а з зяблівам паспеем.

Так, як відаць, разважаюць кіраўнікі Брагінскага, Чачэрскага, Нараўлянскага, Чавускага і іншых раёнаў, якія выканалі план зяблівага ворыва ад 14 да 30 проц. Дзесяткі калгасаў гэтых раёнаў нават не прыступілі да ўздыму зяблівы. Гэтыя людзі, безумоўна, не раз гаварылі, выступалі і выносілі рэзалюцыі аб падёме ўраджайнасці. Але як толькі трэба было перайсці ад агульных размоў да канкрэтных спраў, гэтыя людзі толькі і думаюць аб тым, як-бы знайсці падбольш аб'ектыўных прычын для таго, каб прыкрыць сваю бяздзейнасць.

Характэрным у гэтых адносінах з'яўляецца Чавускі раён. І загадчык райза тав. Сяткоўскі, і кіраўнікі райкома зрыў зяблівы аграўдаюць недахватам цягавай сілы, недахватам людзей. Але даведі пазнаёміцца са становішчам у калгасах «Чырвоны партызан», імя Сталіна, «Заветы Ільіча», «Маяк рэволюцыі», каб упэўніцца, што справа заключаецца выключна ў неўмеінні расставіць людзей і правільна скарыстаць цягавую сілу.

Чым могуць кіраўнікі Чавускага раёна апраўдаць, што ў калгасе «Чырвоны партызан» з 26 коней на зяблеве скарыстоўваецца ўсяго шэсць, а ў калгасе імя Сталіна з 20 вольных коней на зяблеве занята ўсяго восем? Недаацэнка зяблівы ў Чавускім раёне здзіўляецца не толькі на словах, але і на якасці. Заняблене поле ў калгасе імя Калініна ля самага раённага цэнтра скрозь усеяна агрэхамі. Мы спынімся больш падрабязна на Чавускім раёне іменна таму, што ён параўнаўча з іншымі больш забяспечан цягавай сілай. Становішча ў Чавусах характэрна для многіх іншых раёнаў БССР.

Апартуністычная недаацэнка зяблівы ў гэтых і радзе іншых раёнаў прывяла к таму, што на 5 кастрычніка па БССР план зяблівы выканан усяго на 49,8 проц. Апошняя пяцідзёўка дала нават зніжэнне тэмпаў: за пяць дзён прырост ледзьве ўсяго 9 проц. Асабліва адстаюць калгасы МТС, якія выканалі план усяго на 46,3 проц.

І як вынік, БССР у спаборніцтве з Заходняй вобласцю адстала. Там план уздыму зяблівы выканан на 61,7 проц..

Трэба неадкладна ліквідаваць прарыў. Выдзяліць неабходную колькасць рабочай сілы і інвентара і кінуць гэта на ўздым зяблівы.

Масы калгаснікаў, зрабіўшы ў гэтым годзе значны крок уперад па шляху да заможнага жыцця, гатовы з яшчэ большай сілай змагацца за высокі ўраджай будучага года. Задача заключаецца ў тым, каб партыйныя і совецкія арганізацыі на месцах, палітадзелы пабольшэвіску здолелі забяспечыць правільным кіраўніцтвам рашаючы ўчастак барацьбы за ўраджай будучага года — зяблевае ворыва.

Сустрэць дзень ўраджаю і калектывізацыі поўным і высокаякасным завяршэннем зяблівы з'яўляецца спраўдай гонарам, баявым абавязкам кожнага калгаса, сельсавета і раёна.

## АБ ВЫТВОРЧЫМ ПАХОДЗЕ ІМЯ XI УСЕБЕЛАРУСКАГА І VII УСЕСАЮЗНАГА З'ЕЗДАЎ СОВЕТАЎ

*Пастанова пэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР*

Ухвяляючы ініцыятыву перадавых фабрык і заводаў, саўгасаў і калгасаў па ўключэнню іх у вытворчы паход імя VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў советаў і надаючы велізарнейшае палітычнае значэнне ўздыму творчай актыўнасці і ініцыятывы шырокіх працоўных мас у справе разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва за новыя перамогі на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанаўляе:

1. Усім РВК і советам шырока распрацаваць на пленумах РВК і советаў, агульных сходах рабочых, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў пастанову прэзідыума ЦВК Саюза ССР «Аб выбарах у советы 1934-35 гг.» ад 27 верасня г. г. і адозву перадавых прадпрыемстваў і калгасаў па ўключэнню ў вытворчы паход імя VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў советаў, вызначыўшы канкрэтныя мерапрыемствы па ўключэнню ўсіх раёнаў, советаў, прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў у вытворчы паход імя VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў советаў.

2. Прэзідыум ЦВК БССР абавязвае ўсе РВК і советы накіраваць усю сваю работу па падрыхтоўцы да спрэваздачна-перавыбарчай кампаніі советаў і з'ездаў советаў на выкананне планаў у прамысловасці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы, на ўмацаванне абароназдольнасці краіны.

3. РВК і советам разгарнуць барацьбу за поўнае выкананне і перавыкананне промфінплана прадпрыемствамі як па колькасных, так і па якасных паказальніках, за паспяховую падрыхтоўку жывёлы да зімы, за выкананне плана ільнаказагатовак і бульбапаставак, за большэвіцкую арганізацыю продажу хлебных пішчаў дзяржаве, за датэрміновае выкананне фінплана, за стварэнне насенных фондаў з лучшанага і добраякаснага зярна, за арганізацыю культурнага добрабыту як гарадоў, так і вёсак.

4. Прэзідыум ЦВК БССР звяртае асаблівую ўвагу РВК і советаў на арганізацыю работы сярод працоўных аднаасобнікаў па іх уключэнню ў вытворчы паход імя з'ездаў советаў з тым, каб кожная аднаасобная гаспадарка поўнасцю і датэрмінова разлічылася з дзяржавай па абавязковых пастаўках хлеба, мяса, малака, бульбы і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў, каб да перавыбараў советаў і да з'ездаў советаў узняць масавы арганізаваны прыліў бядняцка-сярэдняцкіх аднаасобных гаспадарак у калгасы.

5. РВК і советам арганізаваць пастаянны сістэматычны кантроль і ўлік выканання абавязацельстваў, узятых асобнымі прадпрыемствамі, саўгасамі, калгасамі, аднаасобнымі гаспадаркамі, прыцягнуўшы да гэтай важнейшай справы ўвесь совецкі актыў, усе секцыі і дэпутацкія групы і сістэматычна, не радзей 2-х раз у месяц, інфармаваць прэзідыум ЦВК БССР аб ходзе выканання ўзятых абавязацельстваў да VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў советаў.

6. Устанавіць «чырвоную кнігу» імя XI з'езда советаў БССР, у якую занесці ўсе перадавыя прадпрыемствы, саўгасы і калгасы, раёны, советы і асобных знатных людзей якія прыдуць да з'езда з лепшымі колькаснымі і якаснымі паказальнікамі па выкананню планаў за 1934 год. Заклесенне ў чырвоную кнігу робіцца прэзідыумам ЦВК па прадстаўленню горсоветаў і РВК, наркаматаў і цэнтральных устаноў.

7. Прэзідыум ЦВК БССР заклікае ўсе РВК і советы, усіх рабочых і работніц, калгаснікаў і калгасніц і ўсіх працоўных Совецкай Беларусі дзелавой большэвіцкай работай, на аснове шырокага соцспаборніцтва, зараваць права рапарту VII усесаюзнаму і XI усебеларускаму з'ездам советаў аб сваіх перамогах і быць занесеным у чырвоную кнігу імя XI з'езда советаў БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

3 кастрычніка 1934 г.
г. Менск.

Менскі гарком КП(б)Б скліча 11 кастрычніка, у 19 гадзін, у Дома партактыва

**АГУЛЬНА-ГАРАДСКІ СХОД ПАРТАКТЫВА**

з парадкам дня:
аб падрыхтоўцы да перавыбараў советаў.
Дакладчык тав. ЧАРВЯКОЎ.

Члены і кандыдаты ЦК і Менгаркома КП(б)Б, бюро ЦК і ГК ЛКСМБ, упаўнаважаныя КПК і КСК праходзяць па сваіх мандатах.

Білеты на сход атрымаць 9, 10 і 11 кастрычніка ў ГК КП(б)Б (пакой 53).

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

## У ДУБРОВЕНСКІМ І ЎШАЦКІМ РАЁНАХ ПЕРААПРАЦОЎКУ І ЗДАЧУ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ ПРАДАСТАВІЛІ САМАЦЁКУ

### УСЕ СІЛЫ НА ХУТЧЭЙШУЮ АПРАЦОЎКУ І ЗДАЧУ ВЫСОКАЯКАСНАГА ІЛЬНУ ДЗЯРЖАВЕ. ХЛЕБ, АТРЫМАНЫ ЗА ЛЁН, ВЫДАВАЦЬ ТОЛЬКІ НА ІЛЬНЯНЫЯ ПРАЦАДНІ

Калгаснікі калгаса «Чырвоная зорка», Барысаўскага раёна, мнуць лён.

## Ход загатоўкі ільнапрадукцыі, узняцця ільну са сцелішч, пад'ёму зяблівы, сіласавання, уборкі і загатоўкі бульбы і мясапаставак па БССР

*на 5 кастрычніка 1934 года*

| №№ п. п. | РАЁНЫ | Загатоўлена ільнапрадукцыі ў перавозе на валакно | Загатоўлена ільнавалакна у проц. па плане | Загатоўлена ільнатрасты | Паднята ільну са сцелішч | Паднята зяблівы | Засіласавана | Убрана бульбы | Загатоўлена бульбы | Выканана плана мясапаставак |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Сенненскі | 62,5 | 28,7 | 93,0 | 91,8 | 51,1 | 139,2 | 79,5 | 76,0 | 74,2 |
| 2. | Аршанскі | 60,6 | 55,3 | 80,0 | 99,9 | 101,1 | 138,9 | 92,9 | 89,2 | 64,6 |
| 3. | Дрысенскі | 46,7 | 2,1 | 54,2 | 88,6 | 23,1 | 102,4 | 66,7 | 68,8 | 81,6 |
| 4. | Лёзненскі | 44,2 | 16,7 | 60,3 | 88,9 | 28,7 | 102,6 | 67,2 | 62,8 | 68,3 |
| 5. | Асвейскі | 42,1 | 16,7 | 51,7 | 90,7 | 28,9 | 72,0 | 67,6 | 83,3 | 81,5 |
| 6. | Полацкі | 37,1 | 10,6 | 58,5 | 85,0 | 32,8 | 97,6 | 73,6 | 60,0 | 71,2 |
| 7. | Бешанковіцкі | 30,0 | 7,7 | 51,7 | 95,7 | 40,4 | 102,6 | 90,0 | 92,6 | 76,9 |
| 8. | Пухавіцкі | 27,0 | — | 31,7 | 85,9 | 47,8 | 105,8 | 75,3 | 65,2 | 65,5 |
| 9. | Шклоўскі | 23,6 | 6,2 | 43,1 | 85,7 | 31,1 | 91,3 | 74,1 | 85,6 | 70,8 |
| 10. | Сіроцінскі | 23,2 | 18,5 | 24,2 | 66,8 | 36,0 | 144,7 | 74,7 | 74,8 | 74,6 |
| 11. | Бабруйскі | 22,9 | 0,3 | 52,7 | 77,6 | 52,1 | 84,3 | 80,2 | 72,6 | 69,0 |
| 12. | Касцюковіцкі | 20,9 | 8,5 | 50,1 | 92,2 | 50,4 | 107,2 | 93,3 | 84,5 | 61,9 |
| 13. | Церахаўскі | 19,6 | 3,3 | 42,4 | 95,2 | 57,9 | 93,7 | 84,7 | 73,0 | 68,4 |
| 14. | Горацкі | 19,4 | 20,0 | 18,3 | 70,2 | 41,2 | 74,7 | 83,7 | 84,6 | 79,8 |
| 15. | Прапойскі | 18,2 | 18,2 | — | 100,0 | 60,5 | 107,3 | 80,0 | 58,2 | 70,7 |
| 16. | Чавускі | 13,3 | 3,0 | 24,6 | 81,0 | 33,9 | 186,9 | 76,1 | 83,9 | 65,7 |
| 17. | Гарадоцкі | 12,7 | 3,5 | 23,2 | 85,2 | 39,5 | 89,8 | 85,0 | 72,5 | 72,5 |
| 18. | Чырвонапольскі | 12,7 | 0,3 | 25,2 | 88,1 | 47,2 | 84,0 | 96,0 | 68,8 | 60,8 |
| 19. | Суражскі | 12,5 | 1,0 | 17,1 | 72,5 | 42,6 | 120,1 | 86,3 | 66,2 | 80,6 |
| 20. | Талачынскі | 12,4 | 4,6 | 14,5 | 80,6 | 51,8 | 112,1 | 84,1 | 75,2 | 60,3 |
| 21. | Чашніцкі | 12,4 | 2,0 | 24,0 | 64,6 | 62,1 | 89,1 | 75,9 | 84,2 | 70,8 |
| 22. | Расонскі | 12,4 | 0,4 | 14,0 | 90,8 | 25,8 | 61,2 | 74,0 | 66,4 | 75,0 |
| 23. | Мсціслаўскі | 12,0 | 1,7 | 22,0 | 79,5 | 29,5 | 85,2 | 83,3 | 80,3 | 65,8 |
| 24. | Уваравіцкі | 11,9 | 0,1 | 22,9 | 86,5 | 45,6 | 137,1 | 89,2 | 82,1 | 65,5 |
| 25. | Чэрыкаўскі | 11,8 | 11,8 | — | 90,1 | 67,2 | 204,0 | 80,0 | 90,0 | 68,9 |
| 26. | Крычаўскі | 11,3 | 4,6 | 15,9 | 100,0 | 51,5 | 152,7 | 67,6 | 78,1 | 67,9 |
| 27. | Рагачоўскі | 10,7 | 0,3 | 25,7 | 100,0 | 93,4 | 90,8 | 91,2 | 70,4 | 70,7 |
| 28. | Лельчыцкі | 8,7 | 8,7 | — | 44,3 | 50,5 | 104,0 | 91,2 | 63,7 | 70,9 |
| 29. | Чырвонаслабодскі | 8,4 | 8,4 | — | 71,3 | 71,4 | 100,6 | 90,9 | 89,9 | 69,0 |
| 30. | Менскі | 5,2 | 5,2 | — | 98,7 | 63,8 | 114,7 | 91,6 | 94,3 | 63,8 |
| 31. | Магілеўскі | 8,2 | 1,5 | 20,2 | 96,5 | 100,5 | 101,4 | 97,6 | 76,9 | 80,0 |
| 32. | Лепельскі | 8,2 | 3,3 | 10,0 | 89,4 | 28,1 | 85,3 | 73,1 | 60,3 | 64,0 |
| 33. | Крупскі | 7,1 | 2,3 | 0,4 | 85,2 | 44,4 | 105,8 | 76,1 | 78,3 | 66,9 |
| 34. | Ушацкі | 7,0 | 0,6 | 14,2 | 91,9 | 24,7 | 135,2 | 97,8 | 73,8 | 75,0 |
| 35. | Кармянскі | 6,7 | — | 15,4 | 88,6 | 47,1 | 103,1 | 95,0 | 70,9 | 73,7 |
| 36. | Веткаўскі | 5,3 | 5,3 | — | 81,6 | 43,1 | 74,2 | 83,4 | 68,3 | 61,7 |
| 37. | Клімавіцкі | 3,9 | 3,8 | — | 80,7 | 48,4 | 81,4 | 65,1 | 67,5 | 85,5 |
| 38. | Буда-Кашалёўскі | 3,8 | 3,8 | — | 100,0 | 51,4 | 156,9 | 90,0 | 62,1 | 79,7 |
| 39. | Лагойскі | 3,0 | 3,6 | — | 65,9 | 58,[illegible] | 90,6 | 72,9 | 69,9 | 62,4 |
| 40. | Бягомльскі | 2,6 | 3,1 | — | 81,3 | 48,[illegible] | 112,1 | [illegible] | 79,8 | 72,1 |
| 41. | Старобінскі | 3,[illegible] | 3,0 | — | 87,1 | 87,[illegible] | 77,1 | [illegible] | 66,9 | 82,1 |
| 42. | Тураўскі | 2,[illegible] | 2,5 | — | 74,2 | 70,3 | 115,2 | [illegible] | 77,1 | 76,1 |
| 43. | Слуцкі | 2,7 | 2,[illegible] | — | 77,8 | 82,9 | 114,5 | [illegible] | 88,[illegible] | 73,7 |
| 44. | Капыльскі | 2,7 | 2,7 | — | 64,4 | 58,0 | 102,9 | [illegible] | 85,5 | 74,5 |
| 45. | Дзяржынск | 2,[illegible] | 2,0 | — | 75,3 | 99,8 | 115,7 | [illegible] | 71,1 | 73,8 |
| 46. | Барысаўскі | 2,0 | 2,0 | — | 77,4 | 89,5 | 114,9 | [illegible] | 82,6 | 60,9 |
| 47. | Дзяржынскі | 2,5 | 2,5 | — | 64,9 | 64,3 | 98,9 | [illegible] | 67,1 | 66,8 |
| 48. | Бялынічскі | 2,4 | 2,1 | — | 78,6 | 48,9 | 155,3 | [illegible] | 73,2 | 61,7 |
| 49. | Клічаўскі | 2,3 | 2,3 | — | 98,8 | 81,1 | 99,2 | [illegible] | 75,8 | 62,2 |
| 50. | Любаньскі | 2,3 | 2,3 | — | 93,4 | 67,9 | 130,1 | [illegible] | 95,9 | 86,8 |
| 51. | Быхаўскі | 2,2 | 2,2 | — | 84,8 | 35,7 | 79,7 | [illegible] | 70,1 | 69,9 |
| 52. | Заслаўскі | 2,0 | 2,0 | — | 70,0 | 60,6 | 89,2 | [illegible] | [illegible] | 62,4 |
| 53. | Дубровенскі | 1,[illegible] | [illegible] | — | 67,5 | 39,1 | 97,4 | [illegible] | [illegible] | 65,2 |
| 54. | Нараўлянскі | 1,6 | 1,6 | — | 48,9 | 28,7 | 76,7 | [illegible] | [illegible] | 78,1 |
| 55. | Чэрвеньскі | 1,5 | 1,5 | — | 84,5 | 57,1 | 98,4 | [illegible] | [illegible] | 64,1 |
| 56. | Жлобінскі | 1,4 | 1,4 | — | 68,5 | 42,8 | 86,0 | [illegible] | [illegible] | 63,6 |
| 57. | Віцебскі | 1,3 | 1,3 | — | 88,9 | 41,4 | 101,7 | [illegible] | [illegible] | 73,6 |
| 58. | Лоеўскі | 1,3 | 1,3 | — | 100,0 | 46,3 | 90,7 | [illegible] | [illegible] | 73,7 |
| 59. | Уздзенскі | 1,2 | 1,2 | — | 100,0 | 46,4 | 80,7 | [illegible] | 75,9 | 81,3 |
| 60. | Плешчаніцкі | 1,2 | 1,2 | — | 92,8 | 42,8 | 108,2 | [illegible] | 85,2 | 57,3 |
| 61. | Смалявіцкі | 1,2 | 1,2 | — | 83,7 | 44,0 | 109,3 | [illegible] | 86,3 | 62,8 |
| 62. | Асіпавіцкі | 1,1 | 1,1 | — | 45,9 | 43,2 | 105,1 | [illegible] | 78,3 | 75,9 |
| 63. | Брагінскі | 1,1 | 1,1 | — | 69,4 | 16,1 | 79,9 | [illegible] | 62,6 | 78,4 |
| 64. | Парыцкі | 0,9 | 0,9 | — | 28,5 | 38,9 | 99,5 | [illegible] | 71,3 | 73,6 |
| 65. | Чачэрскі | 0,9 | 0,9 | — | 90,1 | 14,4 | 89,7 | [illegible] | [illegible] | 78,8 |
| 66. | Рачыцкі | 0,7 | 0,7 | — | 60,1 | 34,8 | 89,6 | [illegible] | 74,2 | 64,6 |
| 67. | Хойніцкі | 0,7 | 0,7 | — | 96,7 | 82,7 | 84,9 | [illegible] | 77,9 | 65,9 |
| 68. | Камарынскі | 0,7 | 0,7 | — | 58,9 | 41,2 | 76,9 | [illegible] | 80,6 | 80,8 |
| 69. | Ельскі | 0,6 | 0,6 | — | 34,1 | 42,6 | 90,7 | [illegible] | 67,6 | 77,7 |
| 70. | Мазырскі | 0,5 | 0,5 | — | 58,9 | 46,3 | 101,9 | [illegible] | 73,1 | 73,3 |
| 71. | Глускі | 0,1 | 0,1 | — | 25,5 | 38,4 | 90,3 | [illegible] | 77,5 | 60,0 |
| 72. | Ст.-Дарожскі | 0,07 | 0,07 | — | 12,2 | 57,1 | 82,8 | 72,4 | 70,1 | 52,1 |
| 73. | Петрыкоўскі | — | 0,06 | — | 54,6 | 73,0 | 76,[illegible] | 88,5 | 68,2 | 73,6 |
| 74. | Жыткавіцкі | — | — | — | 33,7 | 57,2 | 94,8 | 72,2 | 50,5 | 79,6 |
| 75. | Гомельскі | — | — | — | 63,8 | 42,1 | 63,7 | 95,8 | 74,9 | 56,4 |

## ПАТУРАЮЦЬ САБАТАЖНІКАМ ЗЯБЛІВА

ЧАВУСЫ. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

На 5 кастрычніка план зяблівы па Чавускаму раёну выканан толькі на 33,9 проц. Прычым, многія калгасы і сельсоветы зяблівы зусім не пачыналі. У Сухараўскім, Робцаўскім, Хацькоўскім і іншых сельсоветах план зяблівы выканан менш, чым на 1 проц.

Загадчык райземаддзела тав. Сяткоўскі тлумачыць гэта тым, што ўсе сілы ў калгасах і аднаасобных гаспадарках кінуты на бульбу і апрацоўку ільну.

Наколькі абгрунтаваны гэтыя довады, паказваюць наступныя факты. У калгасе «Чырвоны партызан», Робцаўскага сельсавета, дзе старшынёй з'яўляецца былы дзяк Арашкоў, летась не было заняблена ніводнага гектара. У выніку ў гэтым годзе «Чырвоны партызан» зацягнуў веснавую сяўбу аж да паловы чэрвеня. Гэта адбілася на ўраджайнасці і вазе працадня. Аднак, урокі мінулага года і зараз не ўлічаны. Зяблівае ворыва ў калгасе яшчэ не пачалі, не гледзячы на тое, што з 26 коней на работах скарыстоўваюцца толькі 6. А вось другі, не менш характэрны, прыклад. У калгасе імя Сталіна трэба ўзняць пад зяблівы 90 гектараў. Тут ёсць 40 коней. На работах занята 20. Астатнія-ж гуляюць, а на зяблівае ворыва выязджаюць не больш 8 коней. Такія-ж факты ў калгасах «Заветы Ільіча», «10-годдзе Кастрычніка», «Маяк рэволюцыі».

Не лепш і з якасцю зяблівы. Літаральна ля самага раённага цэнтра — у калгасе імя Калініна — поле, узнятае пад зяблівы, усеяна агрэхамі.

Раённыя-ж арганізацыі не прымаюць ніякіх канкрэтных мер. **В. Д.**

## ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТВУ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

**Сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР пакінуць за Аршанскім раёнам. Кандыдатам на атрыманне сцяга пакінуць Менскі і Барысаўскі раёны.**

**Папярэдзіць Аршанскі раён аб неабходнасці ўзняцця тэмпаў мясапаставак.**

**Камісія адзначае, што, не гледзячы на неаднаразовае папярэджанне, Барысаўскі раён не ўзняў тэмпаў пераапрацоўкі і здачы ільну, і ваўсабіў мясапастаўкі, што паказвае на тое, што надаецца ільну з боку кіраўніцтва Барысаўскага раёна прадаўжаецца. Камісія ў апошні раз папярэджвае кіраўніцтва раёна, што калі ў бліжэйшуя пяцідзёўку не будуць узняты тэмпы пераапрацоўкі і здачы ільну і мясапаставак, раён будзе знят з кандыдатаў на атрыманне сцяга.**

**Сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР па ільнаводчай зоне пакінуць за Сенненскім раёнам. Кандыдатамі на атрыманне сцяга пакінуць Дрысенскі і Лёзненскі раёны, папярэдзіўшы кіраўніцтва Дрысенскага раёна аб неабходнасці ўзняцця тэмпаў ручнай пераапрацоўкі і здачы валакна, Дрысенскі і Лёзненскі раёны аб тым, што калі тэмпы падняцця зяблівы ў бліжэйшы-я час не будуць рашуча ўзняты, яны будуць знятыя з кандыдатаў на атрыманне сцяга.**

**За падняцце тэмпаў ільнаазагатовак дадаткова занесці кандыдатам на атрыманне сцяга Асвейскі раён, папярэдзіўшы кіраўніцтва раёна аб неабходнасці рашучага ўзняцця тэмпаў зяблівага ворыва і сіласавання.**

**Камісія адзначае, што Бешанковіцкі раён пры рашучым узняцці тэмпаў у ручной пераапрацоўцы і здачы валакна і загатоўцы трасты, можа выйсці ў рады перадавых раёнаў рэспублікі.**

**За ганебны зрыў выканання планаў ільнапрацоўкі і загатовак пакінуць на чорнай дошцы наступныя раёны: Петрыкоўскі, Старадарожскі, Парыцкі, Глускі, Жыткавіцкі і Асіпавіцкі.**

**За павышэнне тэмпаў пераапрацоўкі і здачы ільну зняць з чорнай дошкі Заслаўскі раён, папярэдзіўшы кіраўніцтва раёна аб неабходнасці далейшага яшчэ больш рашучага ўзняцця тэмпаў загатовак ільнапрадукцыі.**

**За зусім ганебныя тэмпы пераапрацоўкі і здачы ільнавалакна занесці кандыдатамі на чорную дошку па ільнаводчай зоне Дубровенскі і Ушацкі раёны; па ільнаводчай зоне — Мазырскі раён.**

**Камісія адзначае, што Гомельскі раён меў і мае ўсе магчымасці быць у радах перадавых раёнаў рэспублікі. Не гледзячы на гэта, Гомельскі раён зусім зрывае пераапрацоўку і здачу ільнавалакна. Зрываецца сіласаванне. Нездавальняюча праходзіць уздым зяблівы. Камісія ў апошні раз папярэджвае кіраўніцтва раёна, што калі ў бліжэйшую пяцідзёўку яны не забяспечаць неабходнага аруху ў выкананні ўсіх асноўных сельска-гаспадарчых кампаній, галоўным чынам пераапрацоўкі і здачы ільнавалакна, раён будзе занесены на чорную дошку.**

**Сцяг палітсэктара МТС НКЗБ пакінуць за Рагачоўскай МТС, папярэдзіўшы МТС аб неабходнасці ўзняцця тэмпаў натураплаты па бульбе.**

**Кандыдатамі на атрыманне сцяга палітсэктара МТС пакінуць: Аршанскую і Хойніцкую МТС.**

**Дадаткова занесці кандыдатамі на атрыманне сцяга палітсэктара МТС НКЗБ: ТУРАЎСКУЮ І МАГІЛЕЎСКУЮ.**

### ХОД СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

на 5 кастрычніка 1934 года (у проц.)

| | БССР | ЗАХ. ВОБЛ. |
|---|---|---|
| Загатоўлена ільнапрадукцыі ў пераводзе на валакно | 18,8 | — |
| Загатоўлена ільнавалакна | 6,8 | — |
| Загатоўлена ільнатрасты | 35,3 | — |
| Паднята трасты са сцелішчаў | 81,2 | 59,0 |
| Зазяблена | 49,8 | 61,7 |
| Засіласавана | 103,5 | 79,4 |
| Убрана бульбы | 83,4 | 71,8 |
| Выканана бульбапаставак | 74,9 | — |

### Чырвоная дошка

Пастановай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносяцца на чырвоную дошку:

АРШАНСКІ раён (сакратар РК Соскін, старшыня РВК Міцькоў);

СЕННЕНСКІ раён (сакратар РК Кац, старшыня РВК Качук);

МЕНСКІ раён (сакратар ГК Рыскін, старшыня оргкамісіі РВК Турэцкі);

ДРЫСЕНСКІ раён (сакратар РК Бурачэўскі, старшыня РВК Антонаў);

ЛЁЗНЕНСКІ раён (сакратар РК Дзеніскевіч, старшыня РВК Шульга);

АСВЕЙСКІ раён (сакратар РК Сердзюкоў, старшыня РВК Мартынаў);

БАРЫСАЎСКІ раён (сакратар РК Чарпышоў, старшыня РВК Баранчык);

### Сорная дошка

За зрыў выканання планаў ільнапрацоўкі і загатовак камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносіць на чорную дошку:

ЖЫТКАВІЦКІ раён (сакратар РК Шокаль, старшыня РВК Дынаў);

ПЕТРЫКОЎСКІ раён (сакратар РК Арашчук, старшыня РВК Град)

СТАРАДАРОЖСКІ раён (сакратар РК Шаланёнак, старшыня РВК Асташонак);

ГЛУСКІ раён (сакратар РК Кузняцоў, старшыня РВК Фейгін);

ПАРЫЦКІ раён (сакратар РК т. Кержаневіч, старшыня РВК т. Андрэенка);

АСІПАВІЦКІ раён (ч. в. а. сакратара РК Фельдман, старшыня РВК Караленка).

# РЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ ВЫСТУПЛЕННІ У ІСПАНІІ

## ЖОРСТКІЯ БАІ ПА ЎСЕЙ КРАІНЕ

ПАРЫЖ, 7 кастрычніка (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, падзеі ў Іспаніі, якія пачаліся ўсеагульнай забастоўкай, перараслі ва ўзброеныя паўстанні. Аб сур'ёзнасці падзей можна судзіць на таму, што ўрад быў вымушан накіраваць супроць паўстаўшых артылерыю, бамбардзіровачную авіацыю і флот.

Згодна паведамлення агенцтва Гавас з Мадрыда, Каталоніі і другія члены каталонскага ўрада арыштаваны і пад аховай войск выведзены з урадавага будынка. Аднак, большасць зачынішчыкаў паўстання, паводле слоў агенцтва, уцякла. Барселонскае радыё, заклікаўшае насельніцтва да паўстання дзейнічала да 6 гадзін раніцы, пасля чаго перадача спынілася. Згодна вестак, баі ў Барселоне і па ўсёй Каталоніі працяваюцца.

Сілы паўстанцаў складаюцца з моладзі левай рэспубліканскай партыі Каталоніі і рабочых-комуністаў і социялістаў. Разам з тым Гавас сцвярджае, што ў Барселоне ўрадавыя войскі прадаўжаюць бамбардыраваць будынкі, у якіх умацаваліся паўстанцы. Снарадамі сур'ёзна пашкоджан фасад урадавага палаца. Войскам нібыта ўдалося заняць пошту і телеграф, захапіць метро. Забіта згодна папярэдніх вестак, 40 чалавек. У цэнтры горада і на акраінах рабочыя пабудавалі барыкады. У ваколіцах горада затрыманы грузавікі, перавозіўшыя ўзброеных паўстанцаў.

Становішча ў самым Мадрыдзе выключна сур'ёзнае. Учора і ў ночы на сёння адбываліся баі паміж рабочымі і войскамі. Ружэйная і кулямётная стрэльба ідзе амаль безупынна. У рабочых кварталах войскі і жандармерыя бессільны справіцца з рабочымі, пабудаваўшымі барыкады.

Учора рабочыя атакавалі цэнтр горада. Жорсткія баі адбываліся на плошчы Пуэрта-дэль-Соль, дзе войскі адбілі атаку рабочых з дапамогай кулямётаў. Рабочыя атакавалі таксама будынкі парламента, міністэрства ўнутраных спраў, земляробства, асветы і паліцэйскія ўчасткі ў розных раёнах горада, а таксама цэнтральны телефон. Усюды паліцыя і войскі адкрывалі кулямётную стрэльбу. Згодна вестак, атрыманых у поўдзень (16 гадзін па маскоўскаму часу) стрэльба ў Мадрыдзе сёння працяваўлася.

Стачка ў Мадрыдзе па-ранейшаму носіць усеагульны характар. Рэфарміцкіе кіраўніцтва чыгуначнікаў не далучалася да стачкі, аднак, чыгуначнікі бастуюць.

Гарнякі Астурыі па-ранейшаму гаспадары становішча ў вугольным раёне каля Овіеда. Частка шахцёраў засела ў гарах і абстрэльвае подступы к раёну, не прапускаючы войска і паліцыі. У самым Овіеда ідуць баі рабочых з войскамі. Для барацьбы з гарнякамі Астурыі на ўзбярэжжа адпраўлены ваенныя судны. У правінцыях Леон, Сан-Себастыян, Більбао і ў радзе правінцыяльных гарадоў, рабочыя захапілі ўладу. Баі ідуць па ўсёй Іспаніі.

## АСТУРЫЯ—У РУКАХ РАБОЧЫХ

ЛОНДАН, 6 кастрычніка. (БЕЛТА) «Сэндэй рэферы» паведамляе, што астурыйскія гарнякі захапілі некалькі прадстаўнікоў адміністрацыі шахт і трымаюць іх у якасці заложнікаў. Газеты прыводзяць маніфест, выпушчаны стачкомам, які гаворыць, што Астурыя ў руках рабочых, жанчыны прымаюць актыўны ўдзел у баях.

«Сэндэй экспрэс» паведамляе, што, наперакор афіцыяльным абвяшчэннням, рабочыя арсенала ў Картагене паўсталі і што да іх далучылася каманда па меншай меры аднаго ваеннага судна.

Начальнік грамадзянскай гвардыі Бебна ў пісьме к прэзідэнту Замора паведамляе, што ён не можа паручыцца за лаяльнасць грамадзянскай гвардыі.

## УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА У ІСПАНСКІМ МАРОКА

ПАРЫЖ, 7 кастрычніка. (БЕЛТА). У іспанскім Марока аб'яўлена ўсеагульная стачка. Паліцыя разагнала ў Тэтуане дэманстрантаў. Губернатар Марока падаў у адстаўку.

## МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

У Катовіцы (Польшча) прыбыў начальнік аддзела друку пры губернатары Мемельскай вобласці Гэруціс. Мэта прыезду — вывучыць гаспадарчыя і социяльныя праблемы нацменшасцей у Польшчы, і ў прыватнасці, у Верхняй Сілезіі.

6 кастрычніка ў Анкары падпісан пратакол аб прадаўжанні дзеяння совецка-турэцкай пагранічнай канвенцыі.

Першы футбольны матч паміж нацыянальна-зборнай Чэхаславакіі і зборнай СССР, які адбываўся ў Празе, закончыўся перамогай СССР з вынікам 9:7

8 кастрычніка ў поўнач на Кубе пачалася ўсеагульная стачка. Адзначаюць, што было кінута каля 30 бомб, якія ўзарваліся, не выклікаўшы ахвяр.

Суд прысяжных ва Львове (Польшча) прыгаварыў 5 чалавек за распаўсюджанне комуністычных лістовак да турэмнага зняволення на тэрміны ад 3 да 5 год. У Луцку суд па справе 4 чалавек, абвінавачаных у комуністычнай дзейнасці, у арганізацыі сялянскіх забастовак і ў «актах сабатажу», прыгаварыў трох к васьмі гадам турмы кожнага, а аднаго к 6 гадам.

Парад аўстрыйскіх паліцэйскіх, узброеных аўтаматычнымі стрэльбамі і супрацьгазамі.

## БАРАЦЬБА ПРАДАЎЖАЕЦЦА

ПАРЫЖ, 8 кастрычніка. (БЕЛТА). Наперакор заспакойваючым паведамленням з Мадрыда, у Барселоне ўчора і да позняй ночы прадаўжаліся баі. Увесь дзень супроць паўстаўшых дзейнічала артылерыя. У многіх месцах пабудаваны барыкады. Адбываецца жорсткая стрэльба.

З ваколічных вёсак узброеныя сялане прабуюць прарвацца ў Барселону, каб аказаць дапамогу рабочым. Пасля труслівай капітуляцыі ўрада Каталоніі кіраўніцтва барацьбой перайшло цалкам у рукі арганізацыі пролетарскага адзінага фронта — «Альянса абрэра».

Паводле апошніх вестак узброеныя рабочыя ўчора вечарам атакавалі ў Барселоне казарму жандармерыі.

Урад раніцу пасылаў новыя падмацаванні ў Барселону, бо «ўрадавыя войскі стомлены». Паўстанне палка ў Херэсе паказвае, што справа ідзе, як кажуць, не толькі аб «стомленасці», колькі аб разлажэнні каўных часцей. У якасці падмацаванняў будуць пасланы калоніяльныя войскі. Зараз у Барселоне 4 контрэвалюцыі. У Каталоніі правінцыі прадаўжаюцца баі паўстанцаў з войскамі.

У Мадрыдзе ўчора рабочыя атакавалі таварны вакзал і Пачтовы вакзал. Рабочыя прабіваюцца да цэнтра горада, каб атакаваць парламент. Дом, у якім засядаў Леруус з другімі членамі ўрада, абстрэлян рабочымі. Стрэльба ідзе ў розных пунктах горада. Пасля 9-ці гадзін вечара прахожыя могуць праходзіць па гораду толькі з паднятымі рукамі, бо паліцыя страляе без папярэджання.

У правінцыі Леон звыше тысячы ўзброеных сялян і 4 тысячы гарнякоў наступаюць на горад Понферада.

Урадавыя паведамленні аб падаўленні паўстання гарнякоў у Астурыі аказаліся хлусліўымі. Учора крайсер абстраляў з цяжкіх гармат раёны, занятыя гарнякамі. Шахцёры прадаўжаюць біцца і трымаюць увесь раён у сваіх руках. У Хіхоне высаджан десант. У цэнтры Астурыі ў Овіедо таксама адбываецца ўпорная барацьба рабочых з войскамі. Газас паведамляе, што па чутках Хіхон захоплен рабочымі. У суседняй правінцыі Леоне гарнякі вядуць баі з войскамі.

Баі рабочых з войскамі і паліцыяй ідуць таксама ў Більбао (сталіца Біскайскай правінцыі), у Сан-Себастыяне як у горадзе, так і ў правінцыі. У Кардове ўлады накіравалі артылерыю для падаўлення паўстаўшых.

Паведамляюць, што падаўленне паўстання ў пяхотным урадавым палку ў Херэсе было выключна прыняцяліўным. Начальнік гарнізона эскадрыльі забіт.

У Лерыдзе паўсталі два палкі. Камандуючы войскамі расстраляны.

Урад закрыў граніцы Іспаніі. Выехаць з краіны можна толькі па спецыяльнаму дазволу охранкі.

## ПАЎСТАННЕ ПЯХОТНАГА ПАЛКА

ПАРЫЖ, 6 кастрычніка (БЕЛТА). Згодна атрыманых з Мадрыда вестак у горадзе Херэсе (недалёка ад Барселона) паўстаў пяхотны полк. Паўстаўшыя салдаты перастралялі афіцэраў, у тым ліку генерала, двух палкоўнікаў і двух капітанаў. Туды накіраваны ўрадавыя войскі.

# БАРЫСАЎШЧЫНА НАПЯРЭДАДНІ XVII ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРА

**В. ЧАРНЫШОУ**

*сакратар барысаўскага РК КП(б)Б*

З вялікімі перамогамі сустракае XVII гадавіну Окцябра Барысаўскі раён.

1934 год з'явіўся годам новых перамог у выкананні промфінплана прадпрыемствамі Барысаўшчыны. Шырока разгортваючы социялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, асноўныя прадпрыемствы Барысава з поспехам выканалі свой 9-месячны промфінплан гэтага года. Фабрыка «Пролетарская перамога», выканаўшы 9-месячны план 5 верасня, прыняла абавязацельства выканаць увесь гадавы план да 10 снежня і даць краіне звыш плана 72.000 яшчыкаў запалак. Выканалі промфінплан за III квартал таксама шклозавод імя Домбаля, гарбарня, лесазаводы камбіната «Комінтэрн» і імя Розы Люксембург і інш.

Для выканання яласных паказальнікаў промфінплана па асобных прадпрыемствах характэрным з'яўляецца прыклад па запалкавай фабрыцы «Пролетарская перамога». Тут планавае заданне па выпрацоўцы на аднаго рабочага складае 16 руб. 09 кап., а фактычнае выкананне — 16 руб. 70 кап. Сабекошт яшчыка запалак па плану не павінен перавышаць 8 р. 89 к., фактычна сабекошт зараз даведзен да 8 руб. 74 кап.

Расце і матэрыяльны добрабыт рабочых. Значна павысілася зарплата 2.300 рабочых надзелены індывідуальнымі гародамі. Капіталаўкладанні на жыллёвае будаўніцтва для рабочых у 1934 г. складаюць 31.000 руб., адрамя гэтага толькі на прадпрыемствах «Бярэзіна», імя Домбаля і «Комінтэрн» адрэмантавана 42 кватэры рабочых і па лініі жылсаюза — 260.

Толькі па названых буйнейшых прадпрыемствах («Бярэзіна», імя Домбаля і «Комінтэрн») перададзены ў індывідуальнае карыстанне рабочых 700 свіней.

Аднак, пры ўсім гэтым у рабоце прамысловасці Барысава ёсць рад недахопаў. Не ўсе прадпрыемствы даюць стопроцантнае выкананне як па колькасных, так і па якасных паказальніках промфінплана (мэблевы цэх камбіната «Комінтэрн», папяровая фабрыка «Профінтэрн», заводы «Чырвоны металіст», «Пролетарскі молат» і імя Молатава).

На прадпрыемствах Барысава недастаткова вядзецца барацьба за аўладанне тэхнікай, за ўшчыльненне рабочага дня, за скарыстанне ўнутраных рэсурсаў.

Асноўная задача партарганізацыі—уключыўшыся ў вытворчы паход імя VII з'езда советаў, прыйсці да XVII гадавіны Окцябра з поўным выкананнем промфінплана па ўсіх паказальніках.

Барысаўшчына дасягнула поспехаў у барацьбе за выкананне лозунга нашага вялікага правадыра таварыша Сталіна аб тым, каб ператварыць усе калгасы ў большэвіцкія і ўсіх калгаснікаў у заможныя.

У выніку ранняй і добраякаснай сяўбы мы дабіліся павышэння ўраджаю. У 1933 годзе адзін гектар даваў у сярэднім па раёну 7,5 цэнтн. зярна, а сёлета мы атрымалі ўжо з гектара 9,5 цэнтнера.

Такі ўраджай на барысаўскіх супясчаных і пясчаных глебах з'яўляецца рэзультатам упартай работы. Калгаснае сялянства авалодвае агратэхнікай. Так, калгас «Чырвоная Трасцяніца» прымяняе торф, карыстаецца раннім заблівам, радковай сяўбой. У калгасе «Чырвоныя рагаткі» пасеў бульбы рабілі па новаму спосабу — у гранкі і па лубінаму ўгнаенню, арганізаваўшы добры догляд пасеваў.

Мы змагаемся за яшчэ больш высокі ўраджай у будучым годзе. Азімыя культуры засеяны да 5 верасня. Выканан план зяблівага ворыва. Поўнасцю засыпаны насенныя і страхавыя фонды.

План хлебапаставак выканан датэрмінова. Заканчваем бульбапастаўкі. Разгорнут продаж ліпкаў хлеба дзяржаве. За першую пяцідзёўку кастрычніка прадана больш 200 тон збожжа. Бліскучыя прыклады па казалі калгасы «Чырвоная зорка» (старшыня т. Каплан), «Маяк социялізма» (старшыня тав. Бардзілоўскі) і рад іншых.

Наш раён, які сабраў лепшы ўраджай па рэспубліцы, абавязан быць у першых радах па закупках хлеба.

Але трэба адзначыць зусім нездавальняючы ход загатовак ільнасемя і ільнавалакна мясапаставак і т. д.

Задача партарганізацыі — рашуча сакрушаючы кулацкі сабатаж, дабіцца ў бліжэйшы час рашучага пералому ў справе выканання гэтых гаспадарча-палітычных кампаній.

Расце калгаснае заможнае жыццё. Калі летась на адзін працадзень у сярэднім прыпадала 2,5 кгр. збожжа і 6 кгр. бульбы, то сёлета — 3,5 кгр. збожжа і 12-13 кгр. бульбы. У калгасе «Чырвоны дуб» увесь час не прыпадала больш 1 кгр. збожжа на працадзень. Сёлета калгаснікі атрымліваюць па 4 кгр. на працадзень. У калгасах імя Варашылава і імя Сталіна прыпадае каля 6 кгр. збожжа і 10 кгр. бульбы на працадзень.

Мы паставілі сваёй задачай, каб не было ні аднаго адстаючага сельсовета і калгаса. Баранскі сельсавет з даўніх часоў быў самым адстаючым сельсоветам. Мы аддалі шмат увагі гэтаму сельсавету і цяпер ён выходзіць у рады перадавых.

На аснове арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацавання калгасаў узмацніўся, асаблива за апошні час, прыліў аднаасобнікаў. З пачатку 1934 г. у калгас прынята 2.100 аднаасобных гаспадарак.

Рэалізуючы пастановы трэцяга пленума ЦК ВКП(б) і кіеўскага пленума ЦК КП(б)Б, мы мабілізавалі партарганізацыю на барацьбу за ўздым жывёлагадоўлі. У раёне ёсць 235 жывёлагадоўчых ферм з 9.930 галоў жывёлы. Павялічана стада жарабят на 350 галоў, буйнай рагатай жывёлы на 8.100 галоў, свіней — на 7.600 галоў, цялят на 3.000 галоў і авец — на 4.000 галоў.

Вялікі ўраджай палявых культур, паўторны ўкос сенажаці, выкананне плана сіласавання на 114 проц. далі нам магчымасць стварыць моцную кармовую базу для жывёлагадоўлі.

На аснове агульнага росту шпарка рушыць наперад і нацыянальна-культурнае будаўніцтва. На тэрыторыі Барысаўшчыны да Окцябрскай рэволюцыі было толькі 12 проц. пісьменных. Зараз раён набліжаецца да суцэльнай пісьменнасці.

У горадзе і раёне мы маем 114 школ, з якіх 97 беларускіх. Уведзена ўсеагульнае пачатковае навучанне. У школах займаецца звыш 15 тысяч дзяцей.

У Барысаве ёсць таксама тры тэхнікумы, тры рабфакі, тры ФЗВ, у якіх навучаецца звыш 20.000 студэнтаў. У мінулым годзе ў Барысаве адкрыт рускі педтэхнікум.

Мы замацоўваем дасягнуты ў мінулым годзе пералом у пастаноўцы марксіцка-ленінскага выхавання партарганізацыі. З 16 верасня арганізавана разгарнулася асенне-зімовая вучоба. Усе комуністы ахоплены партвучобай. Арганізаваны 56 партшкол.

Разгортваецца асенне-зімовая партвучоба і ў вясковай партарганізацыі. Вялікую ролю адыгралі пяцідзёўныя курсы калгаснага актыву.

Ёсць поспехі і ў разгортванні інтэрнацыянальнага выхавання працоўных. Праводзяцца інтэрнацыянальныя масавыя вечары. У гэтай рабоце вялікую ролю адыгрывае раённая мопраўская арганізацыя, якая за ўзорныя паказальніцкі сваёй работы атрымала пераходны чырвоны сцяг ЦК МОПР'а БССР.

# АБ ЗАДАЧАХ ПРАВЯДЗЕННЯ СВЯТА XVII ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

*З пастановы бюро барысаўскага РК КП(б)Б ад 29 верасня 1934 г.*

Совецкі Саюз — ударная брыгада сусветнага пролетарыята, социялістычная радзіма працоўных усяго свету.

БССР — неадрыўная частка вялікага Саюза Совецкіх, социялістычны фарпост на рубяжы з капіталістычным светам, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК ВКП(б) на чале з тав. Сталіным, на аснове правядзення ў жыццё ленінска-сталінскай палітыкі, дзякуючы апрамадзнейшай дапамозе з боку ўсяго СССР ператварылася ў квітнеючую рэспубліку Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік.

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало Барысаўшчына да XVII гадавіны Окцябра дабілася раду перамог. Рабочыя асноўных прадпрыемстваў Барысава (Бярэзінскі камбінат, шклозавод імя Домбаля, макаронная фабрыка імя Леніна, лесазавод імя Розы Люксембург і іншыя) выканалі промфінплан за першае паўгоддзе і з поспехам справіліся з выкананнем плана трэцяга квартала.

Рабочыя соўгасаў і калгаснае сялянства дабіліся далейшых поспехаў у барацьбе за социялістычны ўраджай, за заможнае калгаснае жыццё.

Раён дзтэрмінова выканаў абавязковыя пастаўкі хлеба дзяржаве, асеннюю сяўбу, выканаў план зяблівага ворыва, поўнасцю засыпаў насенныя і страхавыя фонды.

Але асноўная наша задача—не самасупакойвацца на дасягнутым.

Іменна пад гэтым вутлом павінна быць праведзена ўся падрыхтоўчая работа і самое святкаванне вялікай окцябрскай гадавіны.

Выходзячы з гэтага бюро РК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць усе парткомы, первічныя партарганізацыі і дырэктароў прадпрыемстваў, уключыўшыся ў вытворчы паход імя VII усесаюзнага з'езда советаў, забяспечыць да окцябрскіх свят поўнае выкананне планаў кожным прадпрыемствам і ў асаблівасці гэта датычыць мэблевага цэха камбіната «Комінтэрн», фабрыкі «Профінтэрн», завода «Чырвоны металіст» і «Пролетарскі молат», лесазавода імя Молатава.

2. Парторгам калгасаў, старшыням сельсоветаў, калгасаў і шэфарганізацыям у барацьбе за большэвіцкія калгасы, за заможнае калгаснае жыццё:

а) забяспечыць да гадавіны Окцябра выкананне ільнапаставак, мясапаставак, планаў закупкі хлеба, бульбапаставак і інш.;

б) на аснове арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацавання калгасаў і масава-растлумачальнай работы разгарнуць работу па далейшаму прыліву працоўных аднаасобнікаў у нашы калгасныя рады;

в) забяспечыць выкананне пастановы чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б) аб развіцці социялістычнай жывёлагадоўлі. Правесці поўную падрыхтоўку да зімоўкі жывёлы, ацяпляўшы памяшканні для жывёлы, забяспечыўшы кармамі.

3. Профарганізацыям, горсовету, сельсоветам сустрэць окцябрскую годавіну разгорнутым культпаходам: арганізацыяй культмасавай работы ў клубах, дамах культуры; прывядзеннем у належны культурны выгляд інтэрнатаў, кватэр, дамоў працоўных; адданнем большай увагі і клопатаў вучобе нашай дастаўкі; арганізацыяй большэвіцкай барацьбы за аўладанне тэхнікай, рэволюцыйнай тэорыяй і літаратурнамастацкім мінімумам. Умацаваць інтэрнацыянальнае выхаванне, штодзённа аказваючы дапамогу ў рабоце мопраўскім ячэйкам.

4. Парткомам, парторгам, фабзаўмясдкомам разгарнуць яшчэ шырэй социялістычныя метады работы — соцспаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых, калгаснікаў. Памножыць рады герояў социялістычнай будовы—новых людзей нашай гераічнай, выдатнай эпохі.

5. Даручыць парткомам і парторгам забяспечыць правядзенне вечароў рабочых і калгаснікаў з успамінамі аб Окцябрскай рэволюцыі.

6. Даручыць раённа-гарадской камісіі па правядзенню окцябрскіх урачыстасцей распрацаваць план падрыхтоўчай работы і правядзення яго на бюро РК КП(б)Б 5 кастрычніка.

# СКАРЫСТАЕМ БАГАТЫ ВОПЫТ ЛЕНІНГРАДСКІХ БОЛЬШЭВІКОУ

**ЦК КП(б)Б камандыраваў у Ленінград для азнаямлення з пастаноўкай партыйна-масавай і вытворчай работы дэлегацыю беларускіх партыйных работнікаў. У склад дэлегацыі ўваходзілі прадстаўнікі амаль усіх галін прамысловасці БССР. Дэлегацыя азнаёмілася з работай буйнейшых прадпрыемстваў Ленінграда: ЗАВОДА—ВТНУ ІМЯ СТАЛІНА, «ЭЛЕКТРОСИЛА», «СЕВКАБЕЛЬ» ФАБРЫК «БОЛЬШЕВИЧКА» І ІМЯ МЮНЦЕНБЕРГА.**

**1 кастрычніка дэлегацыя была прынята сакратаром Ленінградскага гарадскога камітэта партыі тав. УГАРАВЫМ, з якім мела працяглую гутарку. 2 кастрычніка гарадскі камітэт партыі і рэдакцыя «ЛЕНІНГРАДСКОЙ ПРАВДЫ» АРГАНІЗАВАЛІ СУСТРЭЧУ ДЭЛЕГАЦЫІ З ЛЕНІНГРАДСКІМ ПАРТАКТЫВАМ.**

**Партработнікі Беларусі вынеслі вельмі багаты вопыт пастаноўкі партработы на прадпрыемствах Ленінграда.**

**Сёння мы змяшчаем першы артыкул з серыі пісем па асобных пытаннях работы ленінградскіх прадпрыемстваў і партыйных арганізацый.**

## ПІСЬМЫ З ЛЕНІНГРАДА

## 1. Партдзень

Гэта—незвычайны дзень. Яшчэ за 10-12 дзён раней аб ім усе ведаюць, яго чакаюць, да яго рыхтуюцца.

Гэта партыйны дзень на заводзе «Электросила». Партыйны дзень пазначан на 8 кастрычніка. 24 верасня партком зацвердзіў парадак дня. Ён кароткі: «Прадукцыйнасць працы і арганізацыя рабочага месца».

Парадак дня зацверджан 24-га. У гэты дзень парткамітэт збірае інструкцыйную нараду дакладчыкаў. Кожны з іх прымацован да пэўнага цэха. На нарадзе ён атрымлівае дакладную ўстаноўку аб пастаноўцы пытання, асноўныя матэрыялы і літаратуру.

Справа за дакладчыкам. Ён ідзе ў цэх, вывучае якая ў цэху прадукцыйнасць працы, як арганізавана рабочае месца. Дакладчык дазбірае пэўнае сёлой матэрыял, гульнага пэўнае сёлой матэрыял, і ныні аб парадку, канкрэтнымі ліміі аб

рабоце цэха. Яго першейшы абавязак — перш чым выйсці на трыбуну перад партыйным сходам, дэтальна вывучыць работу цэха. Ён жа прымае ўдзел у падрыхтоўцы комуністаў брыгады і цэха да сходу.

Калі дакладчык лічыць, што падрыхтоўчую работу ён закончыў, партыйны камітэт правярае наколькі цэх падрыхтован да сходу, наколькі кожны комуніст прадумаў парадак дня, наколькі беспартыйныя прымалі ўдзел у падрыхтоўцы да сходу. Выходзячы з гэтага партыйны камітэт мяркуе, ці дазволіць гэтаму дакладчыку выступаць на сходзе.

Дакладчык — галоўная фігура на партсходзе. Ён абавязан не толькі падрыхтавацца сам, але праверыць, як падрыхтавана кожная партгрупа, і дапамагаць за падрыхтоўку.

З другога боку, парторг цэха ў сутарцы з дакладчыкам правярае, наколькі дакладчык вывучыў работу цэха, правярае ўсе яго даныя і ўстанаўляе, наколькі ён гатоў да сходу.

Разам з гэтым сакратар парткома збірае нараду кіраўнікоў бюро інжынерна-тэхнічных секцый цэхаў. З імі ён правяраецца ў выкананні пастановы аб іх удзеле ў падрыхтоўцы і правядзенні партдня.

Дакладчыкі і актыў падрыхтаваны. Што робіць парторг, чым ён заняты, ці не падмяніў яго дакладчык?

Не, парторг ведае свае абавязкі. Цэхавы парторг тав. Ліўшыц сабраў групоргаў. Ён з імі абмяркоўвае задачы кожнай групы, кожнаму дае заданне, выходзячы з умоў яго групы.

Наступнае — работа з кожным комуністам паасобку. Ён правяраецца і авангардную ролю кожнага комуніста, яго прадукцыйнасць працы, заработную плату, нормы выпрацоўкі, якасць прадукцыі, арганізацыю рабочага месца.

Партгрупорг збірае майстраў, гутарыць з імі, выяўляе іх прапановы па парадку дня сходу.

Наступны этап — наглядная агітацыя. Як толькі зацвярджаецца парадак дня партсходу, у цэхах з'яўляюцца аб'явы. Абвяшчаецца калі, дзе, з якім парадкам дня адбудзецца сход. Вышэй мы сказалі, што на парадку дня стаяла толькі адно пытанне. Трэба, каб сутнасць гэтага пытання зразумеў кожны комуніст. І на абвестцы пералічаны як-бы падтэмы гэтага асноўнага пытання. Асноўнае пытанне раскладзена на сустаўныя часткі: як арганізавана рабочае месца, як вытрымліваюцца нормы, фонды зарплаты, наколькі ўшчыльнен рабочы час.

Калі рыхтаваліся да партдня, прысвечанага рабоце партгруп, у цэхах былі вывешаны вокны сатыры «На злобу дня».

Мастацкі зроблены карыкатуры і «сяброўскія шаржы паказвалі, што комуніст Качанаў дэзертуе з грамадскай работы, што партгрупорг Гаршкоў слабарнічае з партгрупоргам Чыгуновым на хутчэйшы развал работы партгрупы.

Тут-жа змешчана карыкатура, паказваючая трох таварышоў, якія спакойна сядзяць за сталом, а зверху надпіс: «Хай партработай займаюцца партгрупоргі». Адсюль відаць, што асобныя комуністы лічаць партработу справай адных толькі партгрупоргаў. Але паказана не толькі дрэнная работа. Вывешана фатаграфія лепшага партарганізатара тав. Куліка і расказ аб тым, як ён працуе.

Ля гэтых вокнаў сатыры збіраліся групы рабочых, абгаварвалі змешчаны матэрыял, і кожны ведаў, што гэтыя факты павінен будзе абгаварыць партыйны сход.

У падрыхтоўцы да партыйнага дня выкарыстоўваецца ўсё: сходы, вывыя газеты, шматтыражкі, штодзённі і т. д.

На заводзе—ВТНУ імя Сталіна рыхтуецца партыйная канферэнцыя. З нумара ў нумар заводская газета «Сталінец» прысвячае цэлыя старонкі падрыхтоўцы канферэнцыі.

У нумары ад 21 верасня газета паказвае партгрупы, якія дрэнна рыхтуюцца да канферэнцыі. 25 верасня газета выкрывае «сакрэты» майстра Нікіфарава і на яго прыкладзе робіць вывад аб тым, што «комуністы павінны быць перадавікамі ва ўзмацненні працоўнай дысцыпліны». У нумары ад 26 газета дае разгорнуты паказ партарганізацыі кузні перад канферэнцыяй.

Мы паказалі гэтыя тры нумары не таму, што яны з'яўляюцца выключэннем. Не. Такая настойлівая падрыхтоўка ёсць сістэма работы ленінградскіх заводскіх партарганізацый і газет.

У сістэму работы ленінградскай партарганізацыі ўвайшлі самасправаздачы комуністаў. Кожны комуніст праз пэўны час робіць сваю справаздачу аб тым, наколькі ён забяспечвае авангардную ролю на ўчастку сваёй работы.

Калі «Сталінец» крытыкуе дрэнную падрыхтоўку да канферэнцыі асобных партгруп, у адной з заметак указваецца, што:

«Пракофьеў (партгрупорг) арганізаваў самасправаздачы двух комуністаў, але больш да канферэнцыі праводзіць не збіраецца. Неабходна сказаць і аб тым, што праведзеныя самасправаздачы праходзілі без падрыхтоўкі. Комуністы Партанен і Фаронаў даведаліся аб тым, што яны пайнны зрабіць самасправаздачы за некалькі гадзін да схода і падрыхтавацца да іх не змаглі».

Гэта, безумоўна, недахоп. Але ўсё-ж гэта гаворыць аб тым, што самасправаздачы ўвайшлі ў сістэму правядзення партсходаў і работы з асобным комуністам. Як метад, самасправаздачы безумоўна сябе апраўдалі. Трэба толькі, каб аб самасправаздачы комуніст ведаў раней і мог своечасова да яе падрыхтавацца.

Парадак дня — асноўнае звяно ў падрыхтоўцы да партдня. Ён павінен быць не расцягнутым і надзвычай канкрэтным.

І не дзіва, што ленінградскі камітэт партыі правёў спецыяльны адзіны партыйны дзень толькі па аднаму пытанню — «Аб барацьбе з хуліганствам». Прычым, падрыхтоўка і правядзенне гэтага дня праходзіла пад кутом арганізацыі адпачынку моладзі, разгортвання культурна-выхаваўчай работы, паляпшання работы клубаў, бо гэтыя практычныя мерапрыемствы павінны забяспечыць культурны адпачынак моладзі і барацьбу з хуліганствам.

Нідаўна ў Ленінградзе быў праведзен спецыяльны партыйна-совецкі дзень. Асноўнае пытанне — жыллёвае будаўніцтва. Комуністы збіраліся па жэнтах, дзе ставіўся даклад старшыні праўлення жак-та і самасправаздачы комуністаў аб тым, як яны практычна ажыццяўляюць рашэнні ЦК ВКП(б) аб жыллёвым будаўніцтве.

Нарэшце, аб правяркі выканання. Яна стала неадлучнай часткай у падрыхтоўцы і правядзенні партыйнага дня.

Рыхтуючыся да партыйнай канферэнцыі, адна партгрупа правярае другую, прычым стрыжнем праверкі з'яўляецца таксама адно пытанне — як выканана рашэнне папярэдняга партыйнага схода.

Сход пачаўся. Першае пытанне парадку дня — праверка выканання рашэнняў мінулага сходу. Тут выкананы рашэнні, што зрабілі адказныя таварышы па адзучанай рабоце.

Вышэй мы адзначалі, што папярэдні сход выносіў вокны-сатыры па выкананню рашэнняў сходу.

Такім чынам праверка выканання — асноўная і неадрыўная частка ў правядзенні партыйнага дня.

Дэтальная і кранкатлівая падрыхтоўка да партыйнага дня, глыбокае вывучэнне сутнасці пастаўленых пытанняў і канкрэтнасць іх, праверка выканання, — усё гэта зрабіла партыйны дзень магутным сродкам выхавання комуністаў.

Партыйныя арганізацыі Ленінграда маюць непераўзойдзеныя ўзоры пастаноўкі партыйнай, масавай і вытворчай работы. Партыйныя арганізацыі Беларусі могуць і павінны перанять вопыт правядзення партдня на прадпрыемствах Ленінграда.

Л. ГЛЕЗЕР.

## АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ СКЛАДУ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЦВК БССР

**ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР**

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Для кіраўніцтва справаздачна-перавыбарчай кампаніяй советаў БССР зацвердзіць наступны склад Цэнтральнай Выбарчай Камісіі ЦВК БССР: т.т. **ЛЯЎКОЎ, БАЛКОВІЧ, КУДЗЕЛЬКА, ЗАКОЎСКІ, КОНІК, СМІРНОЎ, КАВАЛЬЧУК, РАТНЕК, АЎГУСТАЙЦІС, ЛЕНЦНЕР, КУЗЬМІН, ЖУКОВІЧ, ПРАЛІЧ.**

2. Старшынёй Цэнтральнай Выбарчай Камісіі ЦВК БССР назначыць т. **М. А. ЛЯЎКОВА.**

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **А. ЧАРВЯКОЎ.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **М. ЛЯЎКОЎ.**

3 кастрычніка 1934 г.
г. Менск.

### УСЕБЕЛАРУСКІ БЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ VII УСЕСАЮЗНАГА І XI УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДАЎ СОВЕТАЎ

## УКЛЮЧЫЛІСЯ І... ЗАБЫЛІ

**(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).**

У Чавусах чамусці думаюць, што ўсесаюзны паход імя VII з'езда советаў гэта нейкая своеасаблівая кампанія з абстрактнымі мэтамі і якая, такім чынам, адцяпае работнікаў ад канкрэтнай справы.

Упершыню аб паходзе чавускае кіраўніцтва і раённы актыў даведаліся толькі 27 верасня на нарадзе пры РК КП(б)Б. Работнікі райгазеты ўпеслі нават прапанову аб уключэнні ў паход сельсоветаў. Але гэтай прапанове ніхто не надаў ніякага значэння. Сакратар РК тав. Кулікаў, наадварот, недвузначна намякнуў, што «яно, вразумела, паход справа нядрэнная, але... перш за ўсё, трэба ўзяцца за лён...».

Так і разышліся ні з чым. Праўда, на другі дзень па ініцыятыве той-жа райгазеты старшыня РВК т. Буры і яго намеснік т. Гаўрыкаў падпісалі пастанову «аб уключэнні ў паход». Але...

...Прайшоў тыдзень. Ні ў адным сельсовеце нават і не чулі пра паход. Людзі па-ранейшаму фіксуюць прарывы па сіласаванню, па падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы, па разгортванню хлебазакупак, па зяблеву і інш. Нікому тут і ў галаву не прыходзіць такая ясная думка, што паход імя VII з'езда советаў не самамэта, а магутны сродак мабілізацыі мас на знішчэнне памянёных «непаладак».

Нават райгазета — ініцыятар уключэння ў паход — не давяла гачатай справы да канца. Яна абмежавалася змяшчэннем пастановы і на гэтым паставіла кропку.

**ВІТ. ДАЛЬ.**

## ЧЫРВОНАСЦЯЖНАЕ НАСТАЎНІЦТВА ЎКЛЮЧАЕЦЦА Ў ПАХОД

Настаўніцкія калектывы 6-й, 12-й, 13-й і 42-й менскіх школ уключыліся ў вытворчы паход імя з'ездаў советаў і звярнуліся да ўсіх настаўнікаў Менска і Менскага раёна з пісьмом:

Настаўнікі, уключыўшыся ў паход, ранылі за час паходу дабіцца канкрэтных поспехаў у паляпшэнні школьнай работы, у павышэнні ведаў вучняў. Ударным участкам яны выдзяляюць заняткі па мовах і матэматыцы, без цвёрдых ведаў якіх немагчыма ўсваенне другіх дысцыплін. Санітарыя ў калгасах, асабістая гігіена вучняў, беражлівыя адносіны да школьнай маемасці, чытанне дзіцячай мастацкай літаратуры, арганізацыя перапынкаў і выходных дзён, усё гэта знаходзіць поўнае адлюстраванне ў самаабвязацельствах настаўнікаў.

## СЕЛЬСОВЕТЫ, БЯРЫЦЕ ПРЫКЛАД!

Хрыпялеўскі нацыянальны польскі сельсавет, Магілеўскага раёна, уключыўся ва ўсесаюзны вытворчы паход імя VII з'езда советаў. Сельсавет па-ўдарнаму выконвае ўсе сельскагаспадарчыя работы і абавязацельствы перад дзяржавай.

Калгасы сельсавета па-большавіцку змагаюцца за ажыццяўленне пастаноў XVII з'езда партыі і чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б) аб жывёлагадоўлі. У мінулым годзе калгасы налічвалі 453 галовы буйнай рагатай жывёлы, у гэтым годзе—534. Па ўсіх калгасах ужо складзены кармовыя балансы, усе фермы поўнасцю забяспечаны на ўвесь год як грубымі, так і канцэнтраванымі кармамі.

Сельсавет арганізаваў ва ўсіх калгасах дэпутацкія групы.

Уключыўшыся ў вытворчы паход імя VII з'езда советаў сельсавет прыняў рад канкрэтных самаабавязацельстваў.

**Партарг СТРЫЖЭВІЧ.**
**Старшыня сельсавета ПЛЮСКЕВІЧ.**
**Старшыня калгасаў ХАДАРОВІЧ, СІДАРЭЎСКІ, ЖУЧЭНКА, ДАНІЛАЎ.**

### СПАБОРНІЦТВА ВОДНІКАЎ З ЧЫГУНАЧНІКАМІ

## ТАРМОЗЯЦЬ СПАБОРНІЦТВА ВОДНІКАЎ

У верасні флот Дняпра-Дзвінскага басейна павінен быў перавезці 24.678 тон бульбы і гародніны пролетарскім цэнтрам. Перавезена-ж толькі каля 8.000 тон. Верасневы план перавозак сорван. Чаму? Хіба няма бульбы на прыстанях? Нічога падобнага, бульба тыднямі ляжыць і чакае пагрузкі. У адным Прапойску ляжыць 2.000 тон бульбы. У Чачэрску, Карме, Віцебску і Бабруйску ляжаць дзесяткі тысяч тон.

Начальнік службы эксплаатацыі басейна тав. Шкляраў зрыў перавозак тлумачыць мелкаводдзем.

На мазырскім участку флот крастойвае суткамі ў той час, калі патрэбна выключнае манеўраванне кожным асобным судном. Мала зроблена і па мабілізацыі маторнага флота, хоць СНК БССР у сваёй пастанове ад 10 жніўня абавязаў асабіста т. Пачэбута (начальнік басейна) пераключыць увесь маторны флот на перавозкі. А на справе? У Гомелі кацер № 10 доўгі час стаіць на прыколе, у Крычаве стаяць 4 кацеры. Маторны флот Освода і прадпрыемстваў зусім не мабілізаваны. У Гомелі стаіць таксама на прыколе адзін кацер Палесдрука, адзін завода «Спартак», два паравых судны і т. д.

Водзікі БССР уступілі ў спаборніцтва з чыгуначнікамі на хутчэйшую і без страт дастаўку бульбы і гародніны пролетарскім цэнтрам. Апаратчыкі з кіраўніцтва басейна тармозяць гэта спаборніцтва.

**Р. Д.**

## В'ЕЗДЗЕМ ПАРАХОД БЕЗ ЗАТРЫМКІ

**(Пісьмо камандзіра лепшага парахода, бабруйскага ўчастка).**

На глыбокіх пунктах ляжаць тысячы тон бульбы і гародніны для пролетарыяў нашых сталічных гарадоў. Выязка да чыгунак павінна быць праведзена водным транспартам. А дзе выязка зусім адсутнічае. Тыднямі ляжыць бульба і чакае судна.

За апошні час у сувязі з пачатым па ініцыятыве «Звязды» спаборніцтвам водзікаў і чыгуначнікаў паглядаецца поўны ўздых. Асабліва гэта адчуваецца ў нас на бабруйскаму ўчастку. Амаль увесь буксірны флот пераключан на перавозкі бульбы. Нам, камандзірам парахода, ёсць над чым папрацаваць.

Не сакрэт, што большасць суднаў з грузам ночу не ходзяць. А гэта-ж у два разы скарачае колькасць перавозак. Прадаваць ночу можна. Для гэтага патрабуецца толькі ўважлівасць камандзіра і дысцыплінаванасць каманды.

Я работаю камандзірам парахода «8 сакавіка». Параход наш выконвае план. Каманда дысцыплінавана. Кожны ведае сваё месца і акуратна з любоўю і веданнем справы выконвае свае абавязкі. Загады выконваюцца хутка і ўмела.

Зараз мы змагаемся каб параход не стаяў ні мінуты. 29 верасня прыбыўшы да ссыпнога пункта ў 1 гадзіну 30 мінут ночы мы адразу прычапілі гружаныя судны з бульбай і не гледзячы на мелкаводдзе і моцны вецер пілі без затрымкі да самага Бабруйска. Так мы абяцаем працаваць і надалей. Выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва ўсе буксірныя параходы БССР.

**Л. МАСЦЮГІН.**



Шырока разгарнуўся продаж хлеба кааперацыі калгасамі Маскоўскай вобласці. Прадаюць жыта, пшаніцу, авёс і бульбу. Калгасы «Культура», «Яраславец» і «Новае жыццё», Іфрэмаўскага раёна, прывезлі на элеватар 650 цэнтнераў хлеба.

# Змагацца за закупкі хлеба, як і за хлебаздачу

## МАСАВАЯ РАБОТА ЗАБЯСПЕЧЫЛА ПОСПЕХ

**(МЕНСКІ РАЁН, БЕЛАРУСЬ).**

У Менскім раёне (Беларусь) к 6 кастрычніка закуплена 9.020 цэнтнераў хлеба — у 5 раз больш, чым у мінулым годзе.

Раён убраў хлеб у гэтым годзе на 61 дзень раней мінулага года. Ураджай атрымалі на 35 проц. вышэйшы. К 25 жніўня — на 72 дні раней чым у мінулым годзе — мы выканалі гадавы план хлебапаставак, упеслі натураплату МТС і звярнулі дзяржаве насенную пазыку. Калгаснікі атрымалі цяпер на працадзень у 2 разы больш хлеба.

Перадавыя калгасы і аднаасобныя гаспадаркі, выканаўшыя дзяржаўны план хлебаздачы, ужо ў дзень прыезду тав. **Варашылава** ў Менск арганізавалі чырвоны абоз з хлебам, праданым дзяржаве. Не захапляючыся першымі паступленнямі хлеба, мы з асаблівай настойлівасцю ўзяліся за работу. У хлебазакупкі ўключыліся партыйныя і прафесіянальныя арганізацыі заводаў і фабрык.

Занясенне **«Правдой»** Менскага раёна на ўсесаюзную чырвоную дошку — гэта высокая ацэнка нашай работы — яшчэ больш мабілізавала партарганізацыю і калгаснікаў. У вёсках са значнай колькасцю аднаасобных гаспадарак створаны спецыяльныя камісіі сазвейнасці і дапамогі кааперацыі. Асобныя актывісты—тт. Грыгарцэвіч, Машок, Петрычэнка і іншыя — паказалі ўзоры работы і сваім асабістым удзелам у продажы хлеба дапамаглі агульнаму поспеху.

У тых сельсоветах, дзе правільна быў скарыстан беспартыйны актыў, шырока разгорнута масавая работа, закупкі хлеба праведзены ў кароткі тэрмін. Да такіх сельсоветаў можна аднесці Кайкаўскі, Астрашыцка-Гарадзецкі і іншыя.

Падрэнна ўключаны ў хлебазакупкі і кааператыўныя арганізацыі і асабліва сельпо, якія пакліпаціліся аб павелічэнні таварных рэсурсаў для абслугоўвання прадаўцоў хлеба. Многімі сельпо арганізаваны спецыяльныя фургоны, і аўтафургоны, якія раз'язджаюць па раёну.

У радзе месц мы сустрэліся з узмацненнем актыўнасці класава-варожых элементаў. Быў нават выпадак, калі комуніст — старшыня калгаса, не глядзячы на рашэнне калгаснікаў аб продажы хлеба дзяржаве, затрымліваў адпраўку зярна.

Аднак, агульны вынік такі: хлебазакупкі выявілі новыя масы беспартыйнага актыва, адданага партыі і совецкай уладзе. Шырока разгорнутая масавая работа сярод аднаасобных гаспадарак выклікала новы калгасны прыліў. Напрыклад, у Абчацкім сельсавеце арганізаваны два новых калгасы. Узмацніўся прыліў у калгасы ў Гатаўскім, Кайкаўскім і іншых сельсоветах раёна.

**Намеснік сакратара Менскага гаркома Г. ХАДАСЕВІЧ.**
«Правда».

## ДАПАМОГА БЕЛКААПСАЮЗА ЯШЧЭ НЕ АДЧУВАЕЦЦА

**СЯННО.**

Пастанова СНК Саюза ССР аб дазволе продажу хлеба была спатканa ў раёне з вялікім здаваленнем. Раённы камітэт партыі і палітаддзел для растлумачэння значэння гэтай пастановы разаслалі партыйны актыў у сельсоветы і калгасы. Гэты актыў працрацоўваючы пастанову разам з калгаснікамі, адначасова абмяркоўваў які калгасу патрэбен тавар. Галоўная ўвага калгаснікаў была накіравана на падрыхтоўку да зімы.

На сходах складаліся заяўкі кааперацыі на патрэбны калгасу будматэрыял, інвентар, і тут-жа улічваючы магчымасці і патрэбнасці калгаса, выдзяляўся фонд зярна для продажы дзяржаве.

Купляць хлеб толькі ў калгасах — гэта яшчэ поўсцтавы. Таму мы завастрылі ўвагу нашых упаўнаважаных на неабходнасць правядзення масавай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў па продажы імі дзяржаве хлеба. Калгаснікі прадаюць лішкі свайго хлеба і са свайго боку прад'явілі кааперацыі патрабаванне на розныя тавары, у тым ліку: веласіпеды, гадзіннікі, патэфоны.

У раёне ўжо закуплена 220 тон хлеба.

Немайцянскае сельпо ўжо закупіла хлеба больш, чым меркавала. Набліжаюцца да закупкі хлеба, згодна сваіх меркаванняў, Беліцкі і Расіянскі сельсоветы.

Той факт, што немайцянскае, беліцкае і расіянскае сельпо, куды мы кінулі лепшыя сілы раёна, ідуць наперадзе, яшчэ раз сведчыць аб тым, што перадавяраць гэту важнейшую справу кааперацыі і Заготзярно ні ў якім разе нельга. Другія сельсоветы, якія былі прадастаўлены самі сабе, амаль нічога не закупілі. Гэты недахоп мы хутка ліквідуем.

Трэба сказаць, што мы яшчэ не адчуваем, каб Белкаапсаюз пабольшэвіцку ўключыўся ў работу па закупцы хлеба. Замест тавараў патрэбнага калгасніку асартымента, у раён заслалі ватныя штаны і інш. непатрэбныя тавары.

**Сакратар РК КП(б)Б КАЦ.**
**Начальнік палітаддзела МТС БАЯРЧАЧКА.**
**Начальнік палітаддзела МТС КУКСІН.**

## ЯК РАЙКОМ КІРУЕ ХЛЕБАЗАКУПКАМІ

**СТАРОБІН.**

Пастанова ўрада аб закупцы хлеба шырока прапрацавана на нарадах актыва, пленумах сельсветаў, праўленнях калгасаў і агульных сходах калгаснікаў і аднаасобнікаў.

Усе калгасы раёна пастановамі праўлення, агульных сходаў вызначылі спецыяльныя фонды хлеба для продажу дзяржаве з тым, каб на атрыманыя грошы закупіць машын, матэрыялаў, промтавараў і іншага.

Ва ўсіх калгасах агрэмя агульнакалгасных фондаў калгаснікі прадаюць свае лішкі.

Прадаюць хлеб і аднаасобнікі.

Аб росце палітычнай актыўнасці калгасных мас сведчыць факт пасылкі перадавым калгасам «Ударнік» буксірнай брыгады ў адстаючы па закупцы хлеба Чырвонадворскі сельсавет.

На 1 кастрычніка па раёну закуплена 561 тона хлеба. Закупка прадаўжаецца.

У раёне былі факты антыдзяржаўных метадаў закупкі хлеба. У калгасе **«Рассвет»**, Лісталадавіцкага сельсавета, намеснік старшыні старобінскага сельпо **Рыжыкаў**, прысутнічаючы на агульным сходзе непраўільна падлічваў галасы, запісваў прозвішчы калгаснікаў, выступаючых супроць лічбы, прапанаванай актывам калгаса, лаяў калгаснікаў.

Бюро РК і палітаддзел МТС выехалі на месца і разгавалі на гэты абураючы факт. Калгаснікі ўхвалілі пастанову РК і палітаддзела аб прыцягненні Рыжыкава да адказнасці. Агульны сход адналуцца выдзячыў фонд для продажу дзяржаве трох тон хлеба.

Астаткі недабітых [illegible] класава-варожых элементаў [illegible] асобных участках пашыр[illegible] сабатаж продажу хлеба, і [illegible] скарыстаць гэта для падрыву калгаса. Рахункавод калгаса «Чырвоная горка» Пагосцкага сельсавета **Ермаловіч**, былы старшыня калгаса «Абарона чырвонай мяжы» **Лагун** (зняты з работы за развал калгаса), імкнуліся арганізаваць групы менш свядомых калгаснікаў, каб выступіць супроць закупкі хлеба. Але, дзякуючы палітычнай актыўнасці шырокіх калгасных мас, гэтыя кулацкія падпявалы атрымалі рашучы адпор.

На фоне хлебазакупак і **распрацоўкі артыкула тав. Гікало палітычная актыўнасць працоўных мас знайшла сваё праяўленне ў масавым прыліве ў калгасы.** У калгас «Трэці працаючы» (Зажэўскі сельсавет) за апошнія дні ўлілося 69 гаспадарак. Усе ўступіўшы ў калгас прадавалі дзяржаве не менш чым па аднаму цэнтнеру хлеба. У калгасе «Чырвоны пуцілавец», Чапалеўскага сельсавета ўступіла 17 гаспадарак. Звыш 40 гаспадарак улілося ў іншыя калгасы гэтага сельсавета ёсць прыліў і па раду калгасаў раёна.

Слабым звяном у закупцы хлеба з'яўляецца кааперацыя. Райспажыўсаюз і сельпо стаяць у баку ад гэтай справы. У райспажыўсаюзе няма аператыўнага ліку закупленага хлеба. Не арганізаван завоз стымулюючых промтавараў, не абсталяваны магазіны. Няма ні аднаго фургона. Закупка хлеба застала кааперацыю знянацку.

Перад партыйнай арганізацыяй Старобінскага раёна стаіць баявая задача — ні на хвіліну не аслабляць узятыя ў першыя дні тэмпы, давесці справу да канца з тым, каб забяспечыць продаж усіх лішкаў дзяржаве.

**Сакратар РК КП(б)Б БАЯРЧАЧКА.**
**Начальнік палітаддзела МТС КУКСІН.**

## ЗАКУПІЛІ 18000 ПУДОЎ ХЛЕБА

**БАБРУЙСК.**

Калгасы зоны Цялушскай МТС, Бабруйскага раёна, паспяхова справіліся з выканаўчым усіх гаспадарча-палітычных задаўнянняў гэтага года. Вялікая работа праведзена палітаддзелам па адгрузцы бульбы пролетарыям Ленінграда. Абавязковыя пастаўкі бульбы па зоне выкананы 17 верасня. Паспяхова праходзіць па зоне і дзяржаўны гандаль хлебам. Мы меркавалі, што калгасы і калгаснікі прададуць дзяржаве лішкаў 18.000 пудоў.

Вялікая растлумачальная работа, праведзеная палітаддзелам сярод калгаснікаў, мае той рэзультат, што 2 кастрычніка гэта колькасць збожжа калгаснікамі і калгасамі ўжо прадана. Работа на гэтым не спынілася. Закупка хлеба прадаўжаецца.

Непаваротлівасць, непадрыхтаванасць кааперацыі стварае пагрозу для далейшага разгортвання закупак хлеба.

**РОЗАЎ.**

# Пісьмы рабочых і калгаснікаў

## СПРАВЫ ДЫРЭКТАРА БЫХАЎСКАЙ МТС

**(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)**

У калгасе імя ДПУ, Стужэніцкага сельсавета (Быхаўскі раён), збожжа з першага абмалоту раздалі калгаснікам, а не дзяржаве.

Зроблена гэта праўленнем калгаса па прамому загаду дырэктара МТС **Бурака.** У калгасе не аддаецца ніякай увагі і ахове маемасці. Намалочанае збожжа па начах ляжыць у гумне без ніякай аховы. Шмат калгаснай маемасці разкрадзена.

Аб усім гэтым калгаснікі пісалі ў райком, пракуратуру, але ніякіх мер не прынята.

Ш.

***

**БЫХАЎ. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды».**

Некаторыя калгаснікі і селькоры сцвярджаюць, што ў той дзень, калі ў калгасе імя АДПУ выдаваліся авансы, туды прыкандыбаў дырэктар Быхаўскай МТС тав. **Бурак** і сказаў:

— Калі вы ў хуткім часе намалоціце для дзяржавы, то гэты хлеб можна раздаць.

А старшыня калгаса т. **Шыпікаў** яшчэ і зараз гаворыць:

— Ну што з таго, што мы на фунціку раздаём... З таго часу мы больш ні разу не давалі авансаў.

Той факт, што Бурак патурае антыдзяржаўным тэндэнцыям, не выпадковы.

Хто такі Бурак? Гэта чалавек «з вядомымі заслугамі ў мінулым», але які лічыць, што «партыйныя і совецкія законы пісаны не для іх, а для дурняў».

На партыйнай чыстцы ён не змог адказаць на самыя элементарныя пытанні і яго перавялі ў кандыдаты. Замест таго, каб зрабіць для сябе адпаведныя вывады з гэтага факта, т. Бурак паранейшаму, прыкрываючыся сваімі мінулымі заслугамі ў мінулым, займаецца самадурствам, што чамі прымала характар антыпартыйных учынкаў.

Нядаўна быў такі выпадак. У калгасе «Перамога» сабатавалі здачу натураплаты; у калгасе імя Карла Лібкнехта прастойвала трактарная сеялка, а ў калгасе імя Варацылава — складная малатарня. Трэба было тэрміново абгаварыць усе гэтыя факты. Тэлефанавалі ў МТС, у тав. Бурака аўтамабіль. Бурак адмовіў, матыўнуючы тым, што машына занята, а сам паехаў на аўто сваю жонку з Быхава ў Магілеў. Па дарозе назад разам з шофэрам напіўся і разбіў аб дрэва аўтамабіль.

Такіх фактаў безліч. То Бурак прымае проекты спецыялістаў, выдае сябе «за лепшага інжынера», практыкуе сам, будуе, а пасля прыхопліцца ўсё перарабляць, то ён у парывах самадурства хапае ў абярэмкі тэхніка-дзяўчыну і сажае яе ў бочку з водай.

Чаго, напрыклад, варты такі факт. У значнай колькасці калгасаў МТС зусім не скарыстоўваліся конныя малатарні, нават і тады, калі ў гэтых калгасах не было складаных малатарань. Аказваецца — гэта таксама вынік самадурства дырэктара. Вось што піша начальніку палітаддзела тав. Барцешку старшыня калгаса «Стойкі» т. Сідзякоў: «Я не паставіў конных малатарань таму, што дырэктар МТС Бурак гаварыў мне, што я падаплю вам праз пару дзён складаную малатарню і ўсё намалоцім»...

Вынікі падобнага «кіраўніцтва» не прымусілі сябе доўга чакаць. Калгасы МТС і сама МТС не мелі і не маюць плана ўборачных работ. Калгасы МТС значна адстаюць ад калгасаў зоны райса. Калі яшчэ на 15 верасня па раёну план сіласавання быў выкананы на 68,4 проц., па зяблеву на 32,2 проц., то па калгасах МТС нават на 20-е гэтыя лічбы былі куды меншыя (сіласаванне — 55 проц., зяблева — 21 проц.). А хіба не таямнічна тое, што ў зоне МТС па 20 верасня 7 калгасаў не пачыналі яшчэ сеяць пшаніцы, а 16 калгасаў — сіласаваць, што ня гэты-ж дзень план натураплаты па Быхаўскай МТС выкананы толькі на 75 проц.?

Калі-ж работнікі палітаддзела маюць намер прасці якое-небудзь жанглёрнае мерапрыемства ў галіне арганізацыі калгаснай працы — заключэнне ўгодніцкіх і інш., Бурак адмяняе разумні палітаддзела.

—Як-жа быць з такімі работнікамі? — пытаем мы словамі тав. **Сталіна** аб вакнаўшыхся вяльможах», і адказам яго-ж словамі, выказанымі і выпрацаванымі: «Іх трэба без хістання зняць з кіруючых пасад, не глядзячы на іх заслугі ў мінулым, ... іх трэба змяшчаць з пазбаўленнем на службе і апублікоўваць у друку».

**ВІТ. ДАЛЬ.**

**НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА АРШАНСКАГА ЭКСПЛААТАЦЫЙНАГА РАЁНА МББ ЧЫГУНКІ тав. КІРЫЛАВУ**

## ДВА ГАДЫ ВАЛАКІТЫ

(ПІСЬМО ПЕНСІЯНЕРА).

У 1932 годзе я здаў загадчыку страхкасы райпрофсожа-3 (станцыя Орша) т. **Дзямідаву** пенсіённую кніжку для абмену на новую.

Прайшло два з паловай года, а Дзямідаў нават не выслаў ні новай пенсіённай кніжкі, ні грошай, якія мне прылічваюцца за 1932 год.

На пісьмовае запытанне аб прычынах нявысылкі грошай і пенсіённай кніжкі Дзямідаў адказвае: **«Твая асабістая пенсіённая справа страхкасай згублена».**

Не раз я зварачаўся да пракурора, які канкрэтнага нічога не зрабіў.

**КАЗАК.**

**СТАРШЫНІ БЯГОМЛЬСКАГА РВК тав. ШЭМПЕЛЮ**

## БОЛЬШ ГОДА НЕ ВЫДАЮЦЬ ЗАРПЛАТЫ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА).

У мінулым годзе я працаваў на будаўніцтве мсціжскай сяміглодкі **(Бягомльскі раён).**

За час работы я пабудаваў каменны фундамент, 16 пячэй, пяць пячэй атынкаваў і інш. За гэту работу я павінен яшчэ атрымаць 200 руб.

Некалькі раз звяртаўся ў камгас за грашыма і кожны раз адказваюць: «Прыдзіце заўтра—аплацім».

Калі—ж скончыцца гэта цяганіна?

**П. МАРКАЎ.**

**САКРАТАРУ КЛІЧАЎСКАГА РК КП(б)Б тав. ЦІШКЕВІЧУ**

## ЦВЁРДАЗАДАННІКІ— У ПРАЎЛЕННІ КАЛГАСА

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

У праўленне калгаса імя Варацылава, Владзіміраўскага сельсавета (Клічаўскі раён) залезлі былыя цвёрдазаданнікі Карабкін А. і Шамаль Н., якія на чале з старшынёй калгаса Кудраўцовым па шкодніцку адносяцца да калгаснай гаспадаркі.

Не разасланай на лузе ільнатрасне старшыня калгаса дазволіў пасвіць коней.

Не клапоціцца праўленне і аб конскім пагалоўі. У калгасе ёсць 27 коней, а канюшні яшчэ для коней няма. Усе коні стаяць у цесным гумне і даволі часта коні калечацца.

**А. ПІРОЖКІН.**

**САКРАТАРУ ПУХАВІЦКАГА РК КП(б)Б тав. СКАРАХОДУ**

## УСКОПАЎ ЗАКРЫЎ ВЯЧЭРНЮЮ ШКОЛУ

(ПІСЬМО СЛУХАЧОЎ)

Пры талькаўскай пашоўнай сярэдняй школе летась існавала вячэрняя школа для малаграматных.

Сёлета адным росчыркам пяра загадчык пухавіцкага райана тав. **Ускопаў** школу закрыў.

Зараз слухачы вячэрняй школы нідзе не займаюцца.

**ДОЎНАР, БУЛАВІЦКІ, МАРТЫНЧЫК.**

## ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

★ Дзяжурная звакапрыёмніка пры Наркамаце аховы здароўя БССР Шафліна груба адносіцца да хворых. Так пісаў у «Звязду» тав. Мішкін (Менск).

Наркамат аховы здароўя БССР, паведамляе, што за грубыя адносіны да хворых Шафліна знята з работы.

★ Калгаснікі Лосік, Хролікаў, Балінаў з калгаса «Чырвоная сотадзь», Веткаўскага раёна, пісалі, што на малочнай таварнай ферме калгаса здохла 90 цялят у выніку шкодніцкага догляду.

Веткаўскі райпракурор паведамляе, што факты пацвердзіліся. Шкоднікі Казуноў Т., Дарашэнкова М. Усачова аддадны пад суд.

★ З Чырвона-Слабодскага раёна селькор А. А. пісаў у «Звязду», што ў калгасе імя Войкава (Бучацінскі сельсавет) загадчыкам свінёй фермы працуе кулак Фінюк Кастусь, які памарозіў 2000 пудоў бульбы і гэтай гніллю бульбай корміць свіней.

Чырвона-Слабодскі РК КП(б)Б паведамляе, што факты пацвердзіліся. Загадчык фермы Фінюк знят з работы, выключан з партыі і асуджан на тры гады пазбаўлення волі.

Шасейная дарога ў Быгчынскім сельсавеце (Барысаў).

# АБ ХОДЗЕ ВЫКАНАННЯ ПЛАНА ПАСТАВАК ВЕСНАВОЙ ШЭРСЦІ І ЎРУЧЭННЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ НА ПАЯРКУ

## *Пастанова СНК БССР*

Совет Народных Камісараў лічыць галоўным фактычнае становішча з выкананнем абавязковай пастаўкі шэрсці дзяржаве на БССР: на 15 верасня 1934 г. план па веснавой шэрсці выкананы толькі на 78,8 проц., а па ўручэнню абавязацельстваў па шэрсці паярку — на 48,6 проц. Вызначаныя па БССР законам тэрміны пастаўкі веснавой шэрсці — 1 жніўня і ўручэння абавязацельстваў да 15 чэрвеня — сарваны.

Асабліва ганебны ход пастаўкі і ўручэння абавязацельстваў ідзе па Бялынічскаму — 35,6 проц., Талачынскаму — 32,39 проц., Дубровенскаму — 43,7 проц., Рагачоўскаму — 43,16 проц., Чачэрскаму — 43,12 проц., Чырвонапольскаму — 45,30 проц., Кармянскаму — 56,31 проц., Лельчыцкаму раёнах, а таксама Жлобінскаму, Жыткавіцкаму і Лагойскаму раёнах, якія да 15 верасня нічога не зрабілі па ўручэнню абавязацельстваў па паярку.

Адказнымі за гэта з'яўляюцца ў першую чаргу старшыні РВК, якія не зразумелі яшчэ ўсёй важнасці справы своечасовай пастаўкі шэрсці для забеспячэння сыравінай прамысловасці і, не гледзячы на неаднаразовыя ўказанні з боку СНК БССР і ЦК КП(б)Б, не забяспечылі поўнага і своечасовага ўручэння абавязацельстваў як па асенне-веснавой шэрсці, так і па паярку, а таксама своечасовай здачы шэрсці па ўручаных абавязацельствах, праяўляючы ў пасобных выпадках злачынную бяздзейнасць (Бялынічы).

Загатоўчы апарат Саюзгаатшэрсць і асабліва Белзагатсыравіна працуе зусім нездавальняюча, а з боку інспекцыі НКЛегпрома і Белкаапсаюза адсутнічае сістэматычнае, канкрэтнае кіраўніцтва работай загатоўшчыкаў.

Упаўкамзаг не рэагаваў належным чынам на факты буйнага недаўручэння абавязацельстваў пасобнымі раёнамі па вясновa-асенняй шэрсці (Тураў — 49,9 проц., Дуброўна — 44 проц., Менск — 29 проц., Чырвоная Слабада — 24,5 проц., Гомель — 28 проц., Прапойск — 23,4 проц., Сянно — 22 проц., Полацк — 20 проц.) і паярку (Узда — 65 проц., Сураж, Бараніна — Сянно — 51-53 проц.).

Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Даручыць пракурору рэспублікі т. Кузьміну расследаваць факты буйнага недаўручэння абавязацельстваў на здачу вясновa-асенняй шэрсці па Полацкаму (5329), Мазырскаму (1451), Магілеўскаму (2950), Ушацкаму (2747), Чырвонa-Слабодскаму (2731), Сенненскаму (2950) і Тураўскаму (1046) раёнах, на здачу паярка па Уздзенскому, Суражскаму, Бярэзінскаму і Сенненскаму раёнах і канкрэтных винаватых прыцягнуць да крымінальнай адказнасці.

2. Прапанаваць пракурору рэспублікі прыцягнуць да судовай адказнасці загатоўшчыка Бялынічскага райзага т. Шпарбера за поўную бяздзейнасць па здачы веснавой шэрсці і ўручэнню абавязацельстваў на паярку. Старшыні бялынічскага РВК т. Сукало абвясціць суровую вымову і папярэдзіць, што ў выпадку далейшага невыканання імдырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР па шэрсцезагатоўках, ён будзе прыцягнут да судовай адказнасці.

3. Абвясціць вымову старшыням жлобінскага РВК т. Адамчуку, жыткавіцкага РВК т. Дымаву і лагойскага РВК т. Амощаму за непрыняцце неабходных мер да ўручэння абавязацельстваў па паярку.

Прапанаваць БКС т. Баскіну накласці суровае спагнанне на начальнікаў райзагаў гэтых раёнаў, а таксама на кіраўнікоў Белкаапсыравіны тт. Зуманаса і Брыкера, якія не забяспечылі належным чынам выкананне плана загатоўкі веснавой шэрсці да 1 жніўня.

4. Прыняць да ведама паведамленне т. Пехцерава, што кіраўнік Белканторы Саюзшэрсць т. Ларохін і загалчык арцянскай, быхаўскай і горацкай райканторы Саюзшэрсць заняты з работы як незабяспечыўшыя кіраўніцтва загатоўкамі.

5. Прапанаваць упаўкамзагу (т. Красоўскаму) давесці да раёнаў планы па вясновa-асенняй шэрсці ў поўнай адпаведнасці з даннымі ўліку паталоўя на 1 студзеня 1934 года, а РВК давесці да кожнага сельсовета недаручаную колькасць абавязацельстваў, забяспечыўшы іх неадкладнае ўручэнне адатчыкам і спагнанне шэрсці за ўстаноўленым законам парадку.

6. Прапанаваць усім РВК у бліжэйшыя 5 дзён забяспечыць поўнае сканчэнне ўручэння абавязацельстваў на здачу паярка і прасачыць за тым, каб абавязацельствамі было ахоплена ўсё паталоўе па даных уліку УНХУ на 1 ліпеня 1934 г.

7. Папярэдзіць РВК, што 1 лістапада 1934 г. апошні тэрмін здачы шэрсці дзяржаве, у абёме вызначаных планаў і калі з боку РВК неадкладна не будзе зроблен рашучы пералом у справе ўзмацнення кантролю і сістэматычнага, канкрэтнага кіраўніцтва работай сельсоветаў і загатоўшчыкаў, то вінаватыя ў зрыве выканання паставак будуць прыцягнуты да самай суровай адказнасці.

8. Прапанаваць т. Белкаапсаюзу (т. Баскіну), інспектару Наркамлегпрома (т. Пехцераву) і ўпаўкамзагу (т. Красоўскаму) неадкладна камандзіраваць у адстаючыя раёны не менш 15 работнікаў для аказання практычнай дапамогі РВК у справе поўнага ўручэння абавязацельстваў і выканання плана шэрсцепаставак, забяспечыўшы сістэматычны кантроль і канкрэтнае кіраўніцтва работай загатоўчага апарата.

9. Абавязаць т. Пехцерава кожную пяцідзённую інфармаваць СНК БССР аб ходзе ўручэння абавязацельстваў і выканьні плана шэрсцепаставак.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Новы дыпансерны дом для рабочых у в. Гонтці на Смаленшчыне.

## НАСУСТРАЧ XVII ГАДАВІНЕ ОКЦЯБРА

* У соўгасе «Рудабелка» Белмолпромтрэста заканчваецца пабудова двух жылых дамоў, лазні, двух скотных хлявоў і малочнай.

* У малочным соўгасе «Над Нёманам», Уздзенскага раёна, капіталь на рамантуецца былы памешчыкі палац, у якім да свята адкрываюцца клуб, тэатр і сталоўка.

### ЗАКОНЧАНА БУДАЎНІЦТВА ПАЧТАМТА

ВІЦЕБСК.

Кіраўніцтва сувязі закончыла будаўніцтва ў Віцебску новага паштамта. Рад паштовых операцый у новым будынку будуць механізаваны. Абсталёван элеватар для аўтаматычнага падъёму грузаў. Ал крыцё паштамта адбудзецца 15 кастрычніка. (БЕЛТА).

### САДАВІНА І ГАРОДНІНА ДЛЯ РАБОЧАГА СНАБЖЭННЯ

Беларускі садова-гародны трэст у бягучым годзе адаў дзяржаве 10493 цэнтнераў яблык і груш — 148 проц. плана — і 9366 цэнтнераў розпай гароднімы — 80 проц. гадавога плана. Соўгас «Брылеў» адаў 4800 цэнтнераў садавіны, выканаўшы план на месяц раней.

## НА ШАХМАТНЫМ ТУРНІРЫ МАЙСТРОЎ БССР, УКРАІНЫ І ЗАКАЎКАЗЬЯ

ТІФЛІС, 8 кастрычніка. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Дагрываюць адкладзеных партый дало наступныя вынікі. Выйгралі: Сліч 1 Сарокін у Канстанцінопальскага, Сарокін і Кмох у Сліча, Каспаран у Сарокіна і Селезнёва, Гоглідзе у Сарокіна і Рагозіна. Закончыліся партыі ў нічыю Кмоха з Кірылавым і Эбралідзе.

Становішча перад апошнім турам: перамога ў туры забяспечана майстру Гоглідзе (Тіфліс), які ўжо набраў +9 з 12, другое месца — В. Манагонаў +7,5 з 12. Далей Рагозін, Раўзар і Кмох па +6,5 з 12, Верасёў +6 з 12, Сліч, Селезнёў і Манагонаў М. па +5,5 з 12, Кірылаў і Канстанцінопальскі па +5 з 11, Каспаран +4,5 з 11, Сарокін +5 з 12 і Эбралідзе +4 з 11.

Майстар СЛІЧ.

### ТЭЛЕФОНЫ-АУТАМАТЫ У БАРЫСАВЕ

БАРЫСАЎ. Камітэт бярозаўскага горсовета пачаў устаноўку трох тэлефонных аўтаматаў у горадзе.

## АПЕРАТЫЎНЫ СТАРШЫНЯ...

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН

... Жлобінскаму райпракурору трэба будзе як найхутчэй заняцца справай гр-на Старынскага — старшыні калгаса «Вясёлая Асінавіца».

Трэба, мабыць, будзе яго тэрміновa зняць з працы, каб ён не меў магчымасці яшчэ раз сябе жамураметаваць...

У першых чыслах верасня, у той час, як у калгаснай лазні калгаса «Вясёлая Асінавіца» мыліся калгаснікі, у лазню прыляцеў старшыня калгаса гр-н Старынскі.

Перапалоханыя голыя жанчыны кіраразбягаліся па кутках.

Твар старшыні калгаса вытлумачыў аператыўна...

Гэта быў ужо не старшыня калгаса, а цар Навухаданосар да вайго знянаўжэння.

— Не дачакаліся маёй жонкі... Конкі старшыні калгаса...—абурана крычаў Старынскі... — Усю калгасную ваду расплёскалі па сваёй уласніцкай несвядомасці...

Адна з калгаснік сарамліва прыкрываючы венічкам сваю «ўласніцкую несвядомасць», нясмела адказала:

— Ды мы-ж з тваёю жонкаю зляліся вадою. Гэта-ж яна сама не захацела.

Сведкі сцвярджаюць, што слеам за гэтым старшыня пракрычаў:

— Торэадор, самлей у бой...

І кінуўся да калгаснікі Марылі Худалей, схапіў яе за валасы і пацягнуў к выхаду:

— А ну, выйдзем на двор... Я табой канфідэнцыяльна пагутару, —крычаў старшыня.

—Дык я-ж не апранутая...—вырвалася з вуснаў калгаснікі.

— Нічога... І я не кавалер...—урова спыніў калгаснікі Старынскі...—Бач ты яе, якая інтэлігентка знайшлася... Я з цябе гэты паганы інтэлігенцкі дух выганю.

— Паганскі дух будзе выгнаны... — запамкала старэнькая цётка Насця. — Старшыня цябе не інакш як за ведзьму прымае... А ты давядзі яму, што няма ў цябе хваста.

— Сапраўды, ніякага паганскага духу ў ёй няма...—узмаліліся астатнія калгаснікі.

— Эх, вы...—усміхнуўся старшыня.—Я гэта ў перапосным сэнсе пра дух выславіўся, а яны зразумелі мяне ў простым.. Дзярэўня... Безнадзейна махнуў рукой старшыня і выпусціў галаву Марыю Худалей.

Затым ён вышаў з лазні, трымаючы ў руцэ перад сабою клок валос, выдраны з галавы Марылі Худалей.

Змрок атуліў зямлю...

Старшыня калгаса варочаўся дамоў і супакоена напяваў:

— Благословен и день забот,
Благословен и тьмы приход.

...Увечары таго-ж дня старшыня калгаса «Вясёлая Асінавіца» склікаў праўленне.

Доўга праўленне шавяліла мазгамі па пытанню аб здарэнні ў лазні. І, нарэшце, праўленне вырашыла—зняць з Марылі Худалей 5 працадзён за заявагу жонкі старшыні калгаса.

Малайцы праўленцы... Шавеляць мазгамі...

Асінавіца... Асінавіца... Сапраўды вясёлая Асінавіца.

. . . . . .

Таварыш жлобінскі пракурор... З таго часу ўжо прайшло болей за месяц.

...Гэта, можа быць, і непараўнана дробна для чалавека, які прывык да лепшага, але, калі ласка, займіцеся і гэтым дробным здарэннем у калгаснай лазні.

АЛЕША.

# МЕНСК

### МЕНДЗЛЕЕЎСКІ ВЕЧАР.

6 кастрычніка ў перапоўненай зале Дома Тэхнікі ў Менску адбыўся вечар, прысвечаны вынікам юбілейнага менделееўскага з'езда.

На вечары быў заслухан даклад праф. Прыняжаева аб менделееўскім з'ездзе. Праф. Валабрынскі зрабіў даклад аб перыядычнай сістэме элементаў і дыялектычным матэрыялізме.

⊙ ⊙

* НОВЫ СКВЕР адкрываецца на Нова-Барбуйскай вуліцы. Кіраўніцтва добрабыту горсовета закончыла распланіроўку пляцоўкі для сквера.

* 80 ПАДРЫХТОЎЧЫХ КЛАСАЎ адкрыта ў гэтым годзе пры школах горада. Прынята 2300 дзяцей.

* ДВА ВАГОНЫ МАНУФАКТУРЫ І ВАТЫ атрымаў універмаг. Гэтымі днямі чакаецца на 50 тыс. руб. поўкавай тканіны і 500 дамскіх зімовых палітo палешчанай якасці.



Пабудова дома Чырвонай арміі.

### НАДВОР'Е СЕННЯ

Паводле вестак бюро надвор'я ў Менску тэмпература пазетра ночу з 8 на 9 кастрычніка ад 6 да 9 градусаў, сёння днём ад 16 да 19. Зменная-слаістая, высока-слаістая і слаіста-кучавая воблачнасць, без ападкаў. Вятры слабыя, часамі штыль пераменных напрамкаў. Бачнасць умеранная да добрай. Ноччу туман.

⊙ ⊙

* РАБОЧАЕ КАФЭ адкрываецца пры клубе абутковай фабрыкі імя Кагановіча. У клубе абсталявана новая чытальня.

* НАПРАЎКА

У № 204 «Звязды» пад кліше ў адделе «Менск» пераблытан подпіс, яго трэба чытаць: «Хутка ў 13-й беларускай школе пачнуцца заняткі. На здымку: вучні Волкаў і Шалобоўскі сустракаюць, наведаўшы школу напярэдадні пачатку заняткаў».

## НАСУСТРАЧ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

### ПАВЕДАМЛЕННЕ ЦВК БССР

8 кастрычніка ў 18 гадзін у Малой залі пасяджэнняў прэзідыума ЦВК БССР (Дом урада, правае крыло) склікаецца НАРАДА АДКАЗНЫХ РАБОТНІКАЎ ЦЭНТРАЛЬНЫХ УСТАНОЎ сумесна з усімі старшынямі ЦП саюзаў па пытанню аб падрыхтоўцы да перавыбораў саветаў. На пасяджэнне ў абавязковым парадку павінны з'явіцца наркомы і іх намеснікі, ад папітсектара МТС НКЗ, старшыні ўсіх ЦП саюзаў, радыёцэнтра, дырэктар Белдзяржкіно, дырэктар Белдзяржвыдавецтва, рэдактары газет, ЦК ЛКСМБ, представнікі мясцовага гарнізона, Цэнтральнага совета АСО, Гепэўдзірэкцыя, саюза совецкіх пісьменнікаў, Гапэўвастрэ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

### ПАВЕДАМЛЕННЕ

Сёння ў 6 гадзін вечара ў памяшканні клуба імя 8 з'езда профсаюзаў БССР (б. соўгандальслужачых) адбудзецца ПАСЯДЖЭННЕ ПАШЫРАНАГА ПЛЕНУМА ГК ЛКСМБ сумесна з гаспадарнікамі, начальнікамі цэхаў, майстрамі, брыгадзірамі, партыйным і прафсаюзным актывам па пытанню ўшчыльнення рабочага дня.

Даклядваюць: дырэктары заводаў «Комунар», «Вольшэвік», імя Молатава т. т. Драбышэўскі, Бандарчык, Карасік і сакратары комсамольскіх камітэтаў гэтых прадпрыемстваў т. т. Гурвіч, Пецаўер і Гурвіч.

МЕНГАРКОМ ЛКСМБ.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮН.


Першы Дзяржаўны з а т р (БДТ—1) — СЁННЯ ЧЕДАРАСЛЬ. Пачатак у 8 гадзін веч.

Кіно-тэатр Пролетарый — Мастацкі фільм НАТЭЛЛА. У фае—канцэрт муз-джаза

Кіно Інтернацыянал — Совецкі мастацкі фільм ГЯЛІНАЕ ОРА МАЛЕНЬКАЙ ЖАНЧЫНЫ

Кіно СПАРТАК — НОВЫ УСХОДНІ ФІЛЬМ МЗАГО І ГЕЛЛА драма ў 6 частках.

Аддзяленне павышэння кваліфікацыі спецыялістаў сельскай гаспадаркі І ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

пры Бел. с.-г. інстытуце праводзіць набор:

1. На навочна-завочныя курсы павышэння кваліфікацыі зоатэхнікаў і агранамаў з сярэдняй, вышэйшай адукацыяй і практыкаў сельскай гаспадаркі з адрывам без адрыву ад вытворчасці. Працяг навучання 2—10 мес.

2. На аддзяленне падрыхтоўкі зоатэхнікаў і агранамаў—у абёме вуза. Працяг навучання 4 з пал.—5 год.

Прыём заяў на працягу ўсяго года. Падрабязныя ўказанні (праспект) высылаем па атрыманні паштовых марак на 40 кап. БССР, г. Горк., с-г. інстытут, факультэт павышэння кваліфікацыі і завочнага навучання.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Ад 9 кастрычніка ТОЛЬКІ 4 ДНЯ — ЗНОЎ НА ЭКРАНЕ ЛЕПШЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПЕЦЕРБУРГСКАЯ НОЧ — У фае—КАНЦЭРТЫ АРКЕСТРА. Штодзенна 4 сеансы. Пачатак у 5-45, 7-30, 9-15 і 11 — Каса—ад 1 г. дня.

З 10 кастрычніка Наркомасветы арганізуе аднагадовыя КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ НАСТАЎНІКАЎ для няпоўных сярэдніх школ пры наступных педінстытутах і тэхнікумах:

Па гісторыі, геаграфіі—пры Менскім педінстытуце, Гомельскім педтэхнікуме, Магілеўскім педінстытуце (курсы рускіх настаўнікаў).

Па беларускай мове і літаратуры пры педтэхнікумах: Менскім, Арцянскім, Рагачоўскім, Мсціслаўскім, Мазырскім, Рэчыцкім і Віцебскім.

Па рускай мове і літаратуры пры Барысаўскім педтэхнікуме і Магілеўскім педінстытуце.

Па матэматыцы і фізіцы пры Віцебскім педінстытуце.

Па прыродазнаўству і матэматыцы пры Гомельскім педінстытуце.

На курсы прымаюцца настаўнікі, маючыя сярэднюю адукацыю і працаваўшыя на педработе 3-4 гады, а таксама іншыя грамадзяне з сярэдняй адукацыяй.

Настаўнікі прымаюцца на курсы ў парадку камандыравання іх аддзяламі РайАНА, іншыя грамадзяне—на агульных падставах як і ў педВНУ, згодна існуючых правіл.

Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй у памеры 90 руб. у месяц, сталоўкай і інтэрнатам.

НАРКОМАСВЕТЫ БССР.

Дрыбінскаму зоатэхнічнаму тэхнікуму ПАТРЭБНЫ два выкладчыкі: па арганізацыі сельскай гаспадаркі і зоатэхніц. Заявы накіроўваць: м. Дрыбін, Горацкага раёна, зоатэхнічнаму тэхнікуму.

Адвакату ПАТРЭБЕН ПОВЯЛІКІ ПАКОЙ. Пажадана ў цэнтры. Аплата па згодзе. Па умовах звяніць па тэлефону 21-36.

Рэдакцыі газеты „ЗВЯЗДА" ПАТРЭБНЫ МАШЫНІСТКІ, якія добра ведаюць беларускую мову. Звяртацца да сакратара рэдакцыі.

МЕНЯЮ кватэру ў Барысаве ў цэнтры з 2-х пакояў і кухні з усім удобствамі. Даведацца ў Менску па тэл. 24-602.


# БАЛАНС

## гаспадарчых сродкаў дзяржаўнага трэста шклянай прамысловасці БССР „Белшклотрэста"

### На 1-е студзеня 1934 г. і параўнанне яго з данымі бухгалтарскага баланса 1933 г.

| АКТЫЎ: (Склад і размяшчэнне сродкаў) | СУМА: На 1-1—1933 г. | На 1-1—1934 г. |
|---|---|---|
| **I. Асноўныя сродкі** | | |
| 1. Будынкі і будоўлі вытворч. | 1209160—60 | 1343011—2[illegible] |
| 2. Абсталяван. сілав. устаноўкі, машыны і інструменты | 1790130—20 | 1921101—1[illegible] |
| 3. Транспарт | 117020—80 | 320020—8[illegible] |
| 4. Гаспадарчы інвентар | 213210—50 | 227998—6[illegible] |
| 5. Жылыя, гандлёвыя і інш. невытворч. будынкі | 457540—20 | 672101—2[illegible] |
| 6. Іншыя | 101062—41 | 111931—6[illegible] |
| Усяго па I раздзелу | 3888124—71 | 4596164—6[illegible] |
| **II. Вытворч запасы на складзе і ў пуці.** | | |
| 1. Сыравіна, асноўныя, дапаможныя матэрыялы і тара | 951919—39 | 1177813—2[illegible] |
| 2. Паліва | 274778—23 | 450780—4[illegible] |
| Усяго па II раздзелу | 1226697—62 | 1628593—6[illegible] |
| **III. Нескончаная прадукцыя.** | | |
| 1. Астатак незавершан. вытворч. і поўфабрыкатаў | 39469—99 | 96957—01 |
| 2. Нескончаныя капітальн. работы | 139771—46 | 471573—0[illegible] |
| Усяго па III раздзелу | 179241—45 | 568530—0[illegible] |
| **IV. Таварныя запасы.** | | |
| 1. Тавары і фабрыкаты на складах і ў пуці | 1552167—97 | 1367546—8[illegible] |
| 2. Тавары адгружан. і неаплочаныя | 443364—52 | 1155640—4[illegible] |
| 3. Матэрыялы для рэалізацыі і неліквіды | 8872—82 | 8872—8[illegible] |
| Усяго па IV раздзелу | 2004405—31 | 2532060—1[illegible] |
| **V. Грашовыя сродкі.** | | |
| 1. Разлікі і асобныя рахункі ў крэдытных установах | 500798—91 | 355407—0[illegible] |
| 2. Каса і грашовыя пераводы | 11852—25 | 30435—8[illegible] |
| Усяго па V раздзелу | 512651—16 | 385842—8[illegible] |
| **VI. Разлікі** | | |
| 1. Падсправаздачныя сумы | 43592—17 | 23050—70 |
| 2. Дэбіторы | 518570—79 | 617655—25 |
| 3. Выдаткі будучых гадоў | 99087—80 | 324396—17 |
| Усяго па VI раздзелу | 661250—76 | 965102—12 |

| ПРАЦЯГ АКТЫВА | СУМА: На 1-1—1933 | На 1-1—1934 г. |
|---|---|---|
| **VII. Выдзеленыя сродкі** | | |
| 1. Каштоўныя паперы | 5196—25 | 5307—20 |
| 2. Пай, акцыі і ўдзел у інш. арган. | 756145—25 | 469442—8[illegible] |
| 3. Уклады ў крэдыт. установы: а) у промбанк | 63665—79 | 63665—79 |
| б) у ЦКВ | 139000—00 | 422279—0[illegible] |
| Усяго па VII раздзелу | 964007—29 | 960694—[illegible] |
| **VIII. Страты (убыткі)** | | |
| а) За справаздачны перыяд | — | 842248—08 |
| Усяго па VIII раздзелу | — | 842248—08 |
| БАЛАНС | 9436378—30 | 12479236—45 |
| **ПАСІЎ** (Утварэнне і прыінач. сродкаў) | | |
| **I. Унутраныя рэсурсы.** | | |
| 1. Статутныя фонды | 5311525—66 | 6685226—73 |
| 2. Матавыя фонды: | | |
| а) фонд амартызацыі | 125225—82 | 206116—51 |
| б) фубр | 334731—65 | 350991—65 |
| в) іншыя | 19991—92 | 26619—23 |
| 3. Рэзервы | 360975—41 | 188994—96 |
| 4. Узнос асноўн. фондаў па становішчу на I-X-25 г. | 121882—30 | 121882—30 |
| Усяго па I раздзелу | 6274332—76 | 7579851—38 |
| **II. Пазыковыя сродкі** | | |
| 1. Доўгатэрміновыя крэдыты | 680234—36 | 1605837—20 |
| 2. Кароткатэрміновыя пазыкі ў крэдытн. устаноў | 417857—00 | 919543—12 |
| 3. Крэдыторы | 1881956—06 | 2376024—75 |
| Усяго па II раздзелу | 2980047—42 | 4899405—07 |
| **III. Накапленні (прыбытак)** | | |
| а) Папярэдняга перыяда | 181998—12 | — |
| Усяго па III раздзелу | 181998—12 | — |
| БАЛАНС | 9436378—30 | 12479236—45 |

### РЭЗУЛЬТАТЫ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЗА 1933 г.

| УБЫТКІ. | |
|---|---|
| 1. Убыткі ад рэалізацыі тавараў і па аказаных паслугах | 589178—07 |
| 2. Убыткі ад ліквідацыі выбыўшай маемасці | 54714—43 |
| 3. Убытак ад простояў заводаў па незалежачых прычынах | 172884—41 |
| 4. Убыткі ад спісання безнадзейных даўгоў і за пропускам тэрмінаў даўнасці | 64870—84 |
| 5. Іншыя ўбыткі і страты | 142755—96 |
| 6. Страты мінулых гадоў | 342266—94 |
| УСЯГО руб. | 1366670—65 |

| ПРЫБЫТКІ. | |
|---|---|
| 1. Прыбытак ад нескарыстан. рэзерва сумнеўных даўгоў | 46700—00 |
| 2. Прыбытак ад паступлення па безнадзейных даўгах і ад спісання крэдыторскай запазычанасці за пропускам тэрмінаў іскавой даўнасці | 104082—47 |
| 3. Іншыя прыбыткі і даходы | 295753—29 |
| 4. Прыбыткі мінулых гадоў | 77886—81 |
| УСЯГО руб. | 524422—57 |
| Чысты убытак руб. | 842248—08 |
| УСЯГО руб. | 1366670—65 |

**БАЛАНС** разгледжан і зацверджан справаздачна-балансавай камісіяй НКЛП БССР (пратакол № 4 ад 23-III—34 г.) і справаздачна-эканамічным сектарам НКЛП БССР да друкавання дазволен.

СЭС НКЛП БССР ГОРШТЭЙН.

Кіраўнік Белшклотрэста ЯРОЛЬ.

Галоўны бухгалтар ДРАЛКІН.

# ТАБЛІЦА

4-га тыража выйгрышаў па выпуску «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ». (выпуска першага года).

Тыраж адбыўся 1 і 2 кастрычніка 1934 г. у г. САРАТАВЕ.

Выйгрышы палі на наступныя нумары серый і аблігацый:

| №№ серый | №№ аблігацый | Сума выйгрышу | №№ серый | №№ аблігацый | Сума выйгрышу | №№ серый | №№ аблігацый | Сума выйгрышу | №№ серый | №№ аблігацый | Сума выйгрышу |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 00042 | 18*) | 3000 | 03711 | 1—50 | 250 | 09833 | 21*) | 1000 | 14168 | 66*) | 1000 |
| 00076 | 09*) | 500 | 03741 | 66*) | 500 | 09851 | 13*) | 1000 | 14750 | 06*) | 1000 |
| 00188 | 09*) | 1000 | 03812 | 1—50 | 250 | 10073 | 14*) | 500 | 14787 | 02*) | 1000 |
| 00643 | 28*) | 500 | 03813 | 03*) | 3000 | 10332 | 1—50 | 250 | 14737 | 23*) | 1000 |
| 00681 | 03*) | 500 | 03972 | 1—50 | 250 | 10357 | 41*) | 500 | 14806 | 03*) | 500 |
| 00737 | 52*) | 500 | 04126 | 38*) | 1000 | 10393 | 24*) | 1000 | 14927 | 32*) | 500 |
| 00833 | 04*) | 500 | 04187 | 23*) | 500 | 10649 | 1—50 | 250 | 14971 | 27*) | 1000 |
| 00849 | 46*) | 1000 | 04218 | 1—50 | 250 | 10752 | 44*) | 1000 | 15186 | 06*) | 500 |
| 00861 | 14*) | 500 | 04443 | 1—50 | 250 | 11042 | 42*) | 500 | 15434 | 15*) | 1000 |
| 00908 | 14*) | 500 | 04593 | 12*) | 500 | 11291 | 04*) | 500 | 15570 | 37*) | 500 |
| 00916 | 22*) | 500 | 04722 | 01*) | 500 | 11358 | 37*) | 500 | 16421 | 20*) | 500 |
| 00972 | 44*) | 1000 | 04855 | 23*) | 1000 | 11390 | 27*) | 500 | 16634 | 45*) | 500 |
| 01080 | 47*) | 1000 | 05000 | 38*) | 500 | 11416 | 23*) | 500 | 16673 | 42*) | 500 |
| 01202 | 29*) | 500 | 05207 | 46*) | 500 | 11613 | 43*) | 500 | 16698 | 21*) | 500 |
| 01377 | 45*) | 500 | 05442 | 29*) | 500 | 11736 | 21*) | 500 | 17351 | 30*) | 500 |
| 01503 | 18*) | 500 | 05499 | 17*) | 500 | 11753 | 43*) | 500 | 18139 | 10*) | 125 |
| 01527 | 1—50 | 250 | 05887 | 45*) | 500 | 11834 | 11*) | 500 | 17837 | 03*) | 2000 |
| 01807 | 1—50 | 250 | 06114 | 04*) | 500 | 11847 | 53*) | 1000 | 17862 | 39*) | 500 |
| 01885 | 42*) | 500 | 06235 | 42*) | 500 | 11956 | 00*) | 500 | 18078 | 8*) | 1000 |
| 01897 | 11*) | 1000 | 06552 | 38*) | 500 | 12077 | 17*) | 500 | 18348 | 59*) | 500 |
| 01986 | 03*) | 500 | 06566 | 00*) | 1000 | 12145 | 20*) | 2000 | 17914 | 25*) | 500 |
| 02024 | 30*) | 1000 | 06704 | 30*) | 1000 | 12191 | 11*) | 1000 | 18225 | 53*) | 500 |
| 02081 | 07*) | 1000 | 06901 | 25*) | 500 | 12257 | 20*) | 500 | 18398 | 12*) | 500 |
| 02121 | 08*) | 500 | 06930 | 37*) | 500 | 12266 | 1—50 | 250 | 18395 | 45*) | 1000 |
| 02259 | 19*) | 500 | 06934 | 45*) | 1000 | 12450 | 16*) | 500 | 18427 | 32*) | 500 |
| 02322 | 02*) | 500 | 07066 | 25*) | 500 | 12508 | 47*) | 500 | 18569 | 29*) | 500 |
| 02438 | 47*) | 500 | 07169 | 25*) | 500 | 12611 | 14*) | 500 | 18733 | 42*) | 500 |
| 02814 | 11*) | 500 | 07609 | 38*) | 500 | 12653 | 41*) | 500 | 18737 | 50*) | 500 |
| 03088 | 42*) | 500 | 07821 | 09*) | 1000 | 12750 | 53*) | 500 | 18[illegible] | 40*) | 500 |
| 03107 | 18*) | 500 | 07927 | 21*) | 500 | 12883 | 24*) | 500 | 19313 | 11*) | 500 |
| 03231 | 05*) | 500 | 07942 | 08*) | 500 | 12887 | 50*) | 1000 | 19108 | 39*) | 500 |
| 03244 | 38*) | 1000 | 07960 | 41*) | 500 | 13127 | 13*) | 500 | 19079 | 17*) | 500 |
| 03277 | 1—50 | 250 | 08223 | 19*) | 500 | 13444 | 5[illegible] | 500 | 19015 | 10*) | 500 |
| 03281 | 38*) | 500 | 09036 | 06*) | 500 | 13495 | 30*) | 1000 | 19309 | 15*) | 500 |
| 03294 | 10*) | 500 | 09088 | 04*) | 1000 | 13516 | 14*) | 1000 | 19449 | 17*) | 1000 |
| 03323 | 47*) | 500 | 09193 | 05*) | 500 | 13528 | 49*) | 500 | 19614 | 29*) | 500 |
| 03343 | 25*) | 500 | 09221 | 57*) | 1000 | 13561 | 41*) | 500 | 19645 | 07*) | 500 |
| 03431 | 38*) | 1000 | 09399 | 49*) | 500 | 13847 | 26*) | 1000 | 19684 | 43*) | 500 |
| 03541 | 40*) | 1000 | 09447 | 1—50 | 250 | 13853 | 1—50 | 250 | 19689 | 22*) | 1000 |

*) Усе астатнія 49 аблігацый гэтай серыі выйгралі па 250 рублёў.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ І ДЗЯРЖКРЭДЫТУ БССР.


ДА ЎВАГІ ЎРАЧОЎ, ХВОРЫХ І АПТЭК

Пры адсутнасці на мясцах ніжэйпаймянаваных лекарстваў звяртайцеся: „ПОСЫЛГОСТОРГ" Москва, Мясніцкая, 47.

Заказы пасылаюцца паштовымі пасылкамі на суму звыш 1000 руб. акцэптам, для чаго заказчыку патрэбна ўказаць свой кантакарэнтны рахунак. Заказы на суму ніжэй 1000 руб. высылаюцца наложаным плацяжом па атрыманні задатку ў памеры 25 проц. кошту заказа.

АСТМАЛІЗІН
АЭРОН (таблеткі супроць газавага ўдушшя і ператвараюць у часа морскай і паветранай ядзы)
ЮДТЭТРАГНОСТ
ЛІЗАТЫ—мір (флак. і амп.)
ЛІЗАТЫ—цеста „ „
ЛІЗАТЫ—оксамо „ „
ЛІПАЦЭРЭБРЫН табл. і амп.
ЛАКТАН
МАММІН
ОКСІВІРЫДОЛЬ (вен. прафілакт. сродак)
ПІТУІТРЫН
САЙОДЫН (табл.)
СПЕРМІН (амп., амп. і табл.)
СЛАБІТЭЛЬНЫЯ ПІЛЮЛІ (друпчыкі)
СЕКАЛЕН
СТЫПТЫЦЫН (табл.)
СЕРГАЛІН
СПЕРМАЛІНОЛЬ
ТЫРЭОІДЗІН
ТЫМАФІЗІН
ФІЦІН (таб.)
ФІЛІКУЛЕН
ДЭНЦІН
ГУТАПЕРЧА
СТЭНС

ВОХИМФАРМ, Москва, Кривоколенный пер., 12.


Менск, друкарня «Звязды» — Вь пускаючы—А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж—Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер—Е. [illegible]АН, ст. друкар—АНУЧЫН. — Уп. Галоўлітбела № К—3257